ГУД ПЁТР АДАМАВІЧ
ГУД НІНА ІВАНАЎНА

# СВЯТА КВЕТАК

( сцэнарна-метадычныя рэкамендацыі па распрацоўцы свята )

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск - 2004

Змест

1. Уступ. Праграма свята. - с.
2. Конкурс на лепшае мастацкае афармленне дзяржаўных і прыватных тэрыторый і забудоў - с.
3. Кірмаш кветак. - с.
4. Выставачны комплекс " У свеце кветак " - с.
5. " Сустрэча з кветкамі " - сцэнарый тэатралізаванага прадстаўлення - урачыстага адкрыцця свята - с.
6. " Сярод кветак ". Сцэнарый тэатралізаванай Алімпіяды знаўцаў кветак - с.
7. " Каралева кветак " - Сцэнарны план конкурса прыгажосці - с.
8. " Кветкі - прыгажосць зямлі " - Сцэнарый гульнёвай праграмы -с.
9. " Баль кветак " - сцэнарый пазнавальна - забаўляльнай праграмы для моладзі. - с.
10. " Гульнёвае Поле" - парады па арганізацыі рулеткі " Сімволіка кветак", аукцыёна "Кветкі планеты Зямля", кнігі кахання " Сезам або мова кветак", гульняў з кветкамі, гульнёва - пазнавальнай праграмы " Рамонак ", танцаў з кветкамі, кветкавых варожбаў
11. Легенды аб кветках - с.
12. " Аб кветках, надзеях, каханні " - песні і вершы - с.
13. Стравы з кветак. - с.
14. Літаратура - с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# УСТУП

Кветкі і кветкавыя травяністыя расліны іграюць вялікую ролю ў жыцці чалавека, без іх немагчыма жыццё на нашай планеце. Расліны аказваюць уплыў на навакольнае асяроддзе, на мікраклімат, удзельнічаюць у глебаўтварэнні і рэгулююць вадзяны рэжым. Кветкавыя расліны выкарыстоўваюць у народнай гаспадарцы, з іх атрымліваюць харчовую, пладова-ягадную, лекавую і тэхнічную сыравіну. Сёння кветкі вырошчваюць у спецыялізаваных гаспадарках і на балконах, у школах і жылых мікрараёнах, у калектыўных садах і прысядзібных участках. Сёння рэзка ўзрос попыт на кветкавую прадукцыю, які ставіць перад спецыялістамі задачу стварыць кветкавы канвейер на працягу года. А гэта патрабуе і спецыялізаваных мерапрыемстваў па абмену вопытам і прапагандзе кветкавых раслін.

Кветкавыя расліны знайшлі шырокае адлюстрававанне ў духоўным жыцці беларусаў. Мноства казак, легендаў, паданняў, песняў, гульняў, карагодаў звязана з кветкамі і кветкавымі раслінамі. Многія сучасныя паэты і кампазітары звяртаюцца да кветак, чароўнага свету раслін, падымаючы тэмы прыгажосці, натхнення, экалогіі, маралі, эстэтыкі...

З кветкамі звязаны падзеі сямейнага і грамадскага жыцця чалавека і ўвогулле ніводнае свята сёння не абыходзіцца без кветак.

У многіх краінах сусвету - Іране, Балгарыі, Японіі, Францыі, Германіі, Галандыі, Італіі, Швейцарыі і інш. ўжо многія стагоддзі існуюць святы кветак, якія прыносяць людзям радасць сустрэчы з прыгожым, даюць ім магчымасць адчуць хараство і непаўторнасць флоры, а таксама праявіць сваю фантазію і творчасць у працэсе арганізацыі і правядзення святочных дзей..

На тэрыторыі Беларусі , нажаль, масштабнага свята такога роду яшчэ не было.

Актуальнасць увядзення свята кветак у структуру сучаснай святочнай культуры нашай дзяржавы тлумачыцца перш за ўсё экалагічнымі праблемамі, пытаннямі аховы і рацыянальнага выкарыстоўвання прыродных рэсурсаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Па-другое, свята адыграе значную ролю ў эстэтычным і маральным выхаванні чалавека, будзе мецць пазітыўны ўплыў на падрастаючыя пакаленні, закладваючы ў іх беражлівыя адносіны да прыроды, любоў да роднага краю.

Свята рэкамендуецца праводзіць у другой палове чэрвеня - пачатку ліпеня, калі прырода знаходзіцца ў росквіце сваіх жыватворных сіл. У гэты час вельмі спрыяльная надвор"е, яшчэ не настаў перыяд масавых водпускаў у арганізацыях і прадпрыемствах і да свята можна далучыць як дарослых, так і дзяцей, якія знаходзяцца ў загарадніх або гарадскіх летніках адпачынку і могуць мэтанакіравана рыхтавацца да свята.

Сцэнарый свята парадугледжвае стварэнне масава-паліфанічнай дзеі, ў рэчышчы якога будзе ўвасабляцца індывідуальная і калектыўная творчасць людзей, узбагачвацца іх веды, замацоўвацца і развівацца іх навыкі і уменні.

Сцэнарна - рэжысёрскі ход свята, які аб"ядноўвае разрозненыя яго часткі ў адзінае цэлае - гэта аповяд аб кветках. Паколькі на свяце будзе ісці размова пра кветкі розных народаў, то носьбітам сцэнарна-рэжысёрскага хода на нашым свяце будзе багіня расліннасці Флора, якая дзейнічае ў святах многіх краін ( у Беларусі адпаведнага міфалагічнага персанажу няма ). Дапамагаць весці праграмы свята будуць персанажы беларускага фальклору - багіня вясны - Ляля, багіня лета - Цаца (Цьоця ) і лесавік.

Мастацкі вобраз свята, то есць ідэю, увасобленую ў архітэктурна-дэкаратыўным, музычным і пластычных рашэннях, мы назвалі " карагод кветак", сярод якіх галоўнай будзе ВАСІЛЁК - адна з самых любімых кветак беларусаў. У мастацка-дэкаратыўным афармленні карагод кветак у выглядзе differentlyварыянтных вянкоў будзе галоўнай часткай аздаблення святочных пляцовак. У музычным вырашэнні мастацкі вобраз адлюструецца ў песнях і мелодыях аб кветках і кветкавых раслінах. У пластычным вырашэнні мастацкі вобраз увасобіцца ў абрадава-рытуальных, мастацкіх і гульнёвых дзеях, звязаных з кветкамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праграма свята:

9.00 - Конкурс на лепшае кветкавае афармленне дзяржаўных і прыватных тэрыторый і забудоў ( кветнікі, клумбы, рабаткі, бардзюры, салітэры, кветкавыя групіроўкі, модульныя кветнікі, азеляненне балконаў, лоджый, падваконнікаў, палісаднікаў).

10.00 - Радыёмузычная прграма " Аб кветках ".

- " Кветкі вачыма дзяцей " - выстава малюнка, выцінанкі, вышыўкі, разьбы па дрэву; конкурс малюнка на асфальце.

11.00 - " Сустрэча з кветкамі" - тэатралізаванае прадстаўленне -урачыстае адкрыццё свята.

12.00 - Кірмаш кветак.

- "Дзеці - кветкі жыцця " - фестываль дзіцячых творчых калектываў.

- " У свеце кветак " пазнавальна - забаўляльная праграма.

- " Кветкі - прыгажосць зямлі " - гульнёвая праграма.

14.00 - Конкурс паэтаў і кампазітараў на прыз " Залаты васілёк ".

- " Аб кветках, прыгажосці і натхненні " - фестываль культарганізатараў.

- " Кветкі і касметыка " - лекцыя- парада касметолага.

15.00 - Конкурс прыгажосці " Каралева кветак ".

- Вас запрашае гульнёвае поле ( рулетка " Сімволіка кветак ", аўкцыён кветак, " Сезам" або мова кветак - персідская кніга кахання ", віктарына " Кветкі ў паэзіі", варожбы, танцы і гульні з кветкамі ).

- " Карагод пялёсткаў " - фестываль самадзейных калектываў.

16.30 - Парад мод вясенне - летняга сезону.

- " Сярод кветак " - Алімпіяда знаўцаў кветак.

- Музычны салон. Конкурсная праграма " Кветкі ў гуках музыкі ".

17.10 - Пазнавальна-забаўляльная праграма " Рамонак ".

- " Кветкавая смаката " - выстава-конкурс страў і напояў з кветак

- " Краскі лясоў і палёў " - фестываль відэафільмаў аб кветках.

18.00 - Тэатралізаваны канцэрт " Кветкі кахання ".

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- " Баль кветак" - гульнёва-пазнавальная праграма для моладзі.

- Рыцарскі турнір з выбарам дамы сэрца і уручэннем ёй кветкі кахання - маргарыткі.

19.00 - Карнавальнае шэсце

19.30 - Баль - карнавал " Кветкі планеты Зямля".

22.00 - Феерверк

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# КОНКУРС НА ЛЕПШАЕ МАСТАЦКАЕ АФАРМЛЕННЕ ДЗЯРЖАЎНЫХ І ПРЫВАТНЫХ ТЭРЫТОРЫЙ І ЗАБУДОЎ

Мастацка - дэкаратыўнае афармленне горада будзе значна эфектыўней, калі ў працэс яго задумы, распрацоўкі і ўвасаблення будуць падключаны шырокія слаі насельніцтва, арганізацыі, прадпрыемствы і ўстановы. Фантазія людзей розных узроставых катэгорый, тыпалагічных груп і іх актыўная работа дапамогуць зрабіць горад сапраўдным кветнікам. А аб"яднаць творчыя намаганні людзей зможа конкурс на лепшае кветкавае афармленне дзяржаўных і прыватных тэрыторый і забудоў, пераможцы якога атрымаюць граматы, прызы і каштоўныя падарункі. У журы конкурса неабходна ўключыць кветкаводаў, мастакоў, дызайнераў, прадстаўнікоў адміністрацыі горада, т.е. людзей, кампетэтнасць якіх не выклікае ніякіх сумненняў і іх рашэнне можна будзе лічыць неаспрэчным.

Конкурс рэкамендуецца правесці па наступных намінацыях: " палісаднік прыватнай пабудовы ", " палісаднік дзіцячага садку ", " балкон многапавярховага дама ", " сквер сярэдніх, сярэдне-спецыяльных і вышэйшых навучальных устаноў", " зялёная зона арганізацыі, прадпрыемства", " кветкавае афармленне парка ".

І калі першыя тры намінацыі прапануецца арганізаваць на ўмовах поўнай імправізацыі, то да ўдзельнікаў астатніх намінацый рэкамендуецца далучыць мастакоў, дызайнераў, кветкаводаў з тым, каб максімальна ўвасобіць тэматычную накіраванасць свята ў мастацкіх кампазіцыях, кветкавых пано.Асобую ўвагу па тэме: " Мая Айчына - Беларусь", якая ў кветкавых кампазіцыях будзе адлюстроўваць дзяржаўную сімволіку і геральдыку Беларусі, яе памятныя мясціны, партрэты гістарычных асоб, звяроў і птушак і г.д., арганізатары павінны ўдзяліць наступным формам кветкавага афармлення:

1. Кветнікі ( участкі, спалучаючыя газоны, кампазіцыі кветкава-дэкаратыўных раслін, дарожкі і малыя архітэктурныя формы ).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Клумбы ( Невялікія участкі рознай геаметрычнай формы (круглыя, квадратныя, трохвугольныя, фігурныя і да т. п. ).

3. Бардзюры ( вузкія палосы шырыней 10-40 см, састаўленыя з нізкіх кветкавых культур у адзін-пяць радоў ).

4. Массівы ( буйнамаштабныя кветкавыя кампазіцыі плошчай 80-150 м )

5. Модульныя кветнікі ( спалучэнне кветкавага афармлення - вазы, кантэйнеры, геаметрычна правільныя плямы на газонах - з дэкаратыўным замошчваннем і малымі архітэктурнымі формамі )

6. Арабескі ( кветнікі са звілістай канфігурацыяй мяжы )

За дзень-два да свята журы аб"язджае конкурсныя зоны азелянення і вызначае яго пераможцаў, узнагароджванне якіх адбудзецца непасрэдна на свяце.

## КІРМАШ КВЕТАК

На кірмашы можна набыць: кветкі і кветкавае насенне; карціны мастакоў , а таксама паштоўкі з выявамі кветак; медыцынскія прэпараты і лекавыя напоі з кветак, мед; парфюмерныя вырабы, прыгатаваныя на аснове, або з прымяненнем эфірнага масла ружы, рамонка, крываўніка, ліпы, календулы, нагаткоў, дзьмухаўца; ружовае варэнне і ружовая вада, прыгатаваныя з пялёсткаў ружы; аудыёкасеты з запісамі рамансаў, песень і інструментальных твораў аб кветках.

Працуе выстава - продаж кніг з раздзеламі " Як вырошчваць кветкі ",

" Парады кветкаводам-аматарам ", " Пакаёвае кветкаводства ", " Кветкі ў паэзіі і музыцы ", " Садаводства і мастацкія сады ". На гэтай выставе праводзіцца кніжная латарэя.

Асобнае месца на кірмашы займае выстава-продаж інструментаў, якія прымяняюць у садаводстве і кветкаводстве. Тут наведвальнікам прапануюць нажы (прывівачны, акуліровачны, садовы вялікі і садавы малы), інструменты для абразання ( сучкарэз з верхнім захопам, секатар садавы, ножніцы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шпалерныя, піла лучковая, піла лучковая з паваротным палатном, нажоўка папярэчная, нажоўка серпавідная, піла-нажоўка ), інвентар для ачысткі слупоў дрэў і кустоў, пабелкі, абеззаражвання зрэза, раны, дупла ( шчотка стальная для ачысткі слупа, шчотка стальная садовая, пэнзель валасяны, пэнзель з мачалкі, скрабок для ачысткі кары дрэў, скрабок для ачысткі шчылін і дуплаў), інвентар па апрацоўцы глебы ( лейкі, цапка пяцізубовая, рыдлёўкі: садовая, універсальная і папярэчная, вілы-рыдлёўка, граблі стальныя каваныя і штампаваныя з устаўленымі зубамі, вілы-матыга, культыватар, савок, батанічная капалка, культыватар-плужок).

На кірмашы прадстаўлены посуд і абсталяванне для догляду за пакаёвымі раслінамі : пінцэт, пульвелізатар, нож для абразання, матэрыял для падвязвання, кольцы, нажніцы, кашпо , вазоны, зямля, драўняны вугаль, сподачак- падстаўка, палівачка, інсектыцыды і ўгнаенні, мяккая губка.

Аматараў кветкаводства, несумненна, зацікавіць і выстава-продаж мінеральных угнаенняў. Пакупнікі могуць тут набыць простыя, складаныя, камбінаваныя і змешаныя мінеральныя ўгнаенні, сярод іх - аміячная, натрыевая, кальцыевая салетра, хлорысты амоній, суперфасфат просты і гранулёраваны, фасфарытная мука, хлорысты калій, калійная соль, сернакіслы калій, калімагнезія.

Гандлёвыя латкі афармленыя ў выглядзе кветак. Па кірмашы ходзяць каробачніцы - дзяўчаты ў беларускіх нацыянальных строях, якія прапануюць пакупнікам кардонныя галаўныя ўборы ў выглядзе розных кветак ( рамонак, васілек, мак і да т.п.), паветраныя шары, надзьмяныя геліем, пернікі-кветачкі, цукеркі " Рамонак ", " Васілёк " і да т.п. ).

Адной з форм праяўлення на кірмашы індывідуальнай і калектыўнай творчасці ўдзельнікаў свята можа стаць конкурсная выстава хатніх гаспадынь " Кветкавая смаката ". У гэтай выставе ўвазе наведвальнікаў прадстаўнікі ўсіх узроставых катэгорый прапануюць розныя стравы і напоі, у рэцэптуру якіх ўваходзяць кветкі, а таксама кандытарскія вырабы - печыва, тарты, цукеркі ў выглядзе " кветак " і "кветкавых " кампазіцый. У выстаўцы ўдзельнічаюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гаспадыні вёсак раёна і прадстаўнікі розных гарадскіх арганізацый, якіх можна аб"яднаць у спецыялізаваныя падворкі па тэрытарыяльнаму прынцыпу. Для больш зручнага агляду выстаўленых конкурсных экспанатаў і дэгустацыі страў усе прадстаўленыя вырабы прапануецца падзяліць на наступныя спецыялізаваныя раздзелы: закускі, першыя стравы, другія стравы, дэсерт, кандытарскія вырабы, безалкагольныя і алкагольныя напоі. Пасля дэгустацыі страў членамі журы на выставе праводзіцца продаж асобных экспанатаў і аўкцыён тартоў.

У цэнтры кірмаша размешчана эстрада ў форме вялізнага круга, акаймлёнага пялёсткамі розных колераў вяселкі. На гэтым галоўным мізансцэнічным пункце свята будуць адбывацца абрадава-рытуальныя і галоўныя відовішчныя і гульнёвыя дзеі.

ВЫСТАВАЧНЫ КОМПЛЕКС

Асфальт перад выставачным комплексам размаляваны фарбамі і ператвораны ў кветкавы дыван.

Уваход у выставачны комплекс агароджаны гірляндамі з папяровых кветак. Дрэвы, якія акаймляюць комплекс, упрыгожаны рознакаляровымі стужкамі і папяровымі кветкамі, што ў сукупнасці стварае эфект кветкавага букету. Перад уваходам у комплекс - клумба " кветкавы гадзіннік " (цыферблат, у цэнтры - палачка-кветка, вакол якой кветкі высаджаны такім чынам, што ў пэўныя гадзіны раскрываюцца пялёсткі пэўнага сорту кветак).

У пачатку комплексу - фотастэнд " Чырвоная кніга Беларусі", дзе размешчаны фотаздымкі, ўнізе якіх - надпісы з назвамі знікаючых відаў палявых і лясных кветак.

На выставе " Кветкі маёй Радзімы" экспануюцца садовыя, пакаёвыя, палявыя, лясныя кветкі - ў вазах, карзінах, гаршках, дзе на этыкетках указаны назвы кветак, іх сорт , прозвішча кветкавода або назва калектыва, які іх вырошчваў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На выставу накіроўваюцца лепшыя узоры кветак з батанічных садоў, аранжэрэй, пітомнікаў, дачных і прысядзібных дзялянак кветкаводаў-аматараў, зялёнгасаў, школ, лясгасаў, дзяржаўных устаноў, арганізацый і прадпрыемстваў, арганізацый розных форм уласнасці, аматарскіх аб'яднанняў.

Побач з радамі жывых кветак у спецыяльным павільёне на вольным паветры размешчана выстава " Прырода і фантазія". Тут можна пабачыць розныя кветкавыя скульптуры ( каркасы жывел, птушак і інш., упрыгожаныя зелянінай, кветкамі), экспанаты экібаны (букеты, карціны ), панно, вырабленыя з засушаных кветак і раслін. На выставе аматары фларыстыкі прапануюць жадаючым набыць карціну або паштоўку з засушаных траў.

Адным з раздзелаў выставачнага комплексу з'яўляецца выстава экзатычных кветак і раслін, на якой асобны куток адведзены кактусаводам. Тут арганізатары праводзяць аўкцыён насення і цыбулін рэдкіх раслін і кветак.

У цэнтры выставачнага комплексу ўсталявана відэасценка з некалькіх тэлевізараў, па якіх ідзе дэманстрацыя відэафільмаў аб кветках і кветкаводах. Пад відэасценкай знаходзіцца невялічкая эстрада, з якой кветкаводы-спецыялісты і аматары дзеляцца з наведвальнікамі выставы вопытам па вырошчванні кветак і ўходу за імі, а таксама выступаюць творчыя калектывы і асобныя выканаўцы.

Побач з відэасценкай знаходзіцца выстава мастакоў " Кветкі у творах жывапісу", дзе можна праглядзець карціны і рэпрадукцыі карцін мастакоў сусвету, атрымаць уласны партрэт з кветкамі ў руках, які зробіць мастак-маменталіст. ( Пад карцінамі і рэпрадукцыямі карцін мастакоў рэкамендуецца змясціць тэкст вершаў або мастацкай прозы аб адлюстраванай кветцы, які будзе дапаўняць мастацкі вобраз жывапіснага палатна). Для гэтай выставы , акрамя твораў беларускіх аўтараў, можна ўзяць наступныя рэпрадукцыі карцін мастакоў: М.А. Врубель " Бэз ", К.А. Каровін " Розы і фіялкі ", І.Н Крамскі " Букет кветак", І.Н Левітан "Луг на ўзлессі ", " Начныя фіялкі "; В.Д. Паленаў " Бабулін сад ", І.Я. Рэпін "Дзяўчынка з букетам ", В.А Сяроў " Бэз ", І.І. Шышкін " Траўкі ", С.В. Герасімаў " Іва квітнее ", А.М

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Грыцай " Пралескі ", А.Кастееў " Квітнеючыя яблыні ", А.А. Рылоў " Зялены шум "; творы армянскага мастака М.С. Сар'яна " Ерэванскія кветкі", " Восеньскія кветкі і фрукты " і іншыя рэпрадукцыі твораў мастакоў.

Спецыяльнае месца на святе выдзелена для " Кветкавай аптэкі ". Пакупнікам тут прапануюць лекавыя сродкі з кветак і раслін, фітачаі, рэцэптуру лекаў, зборы зёлак, рэкамендаваныя пры розных захворваннях, спосабы прыгатавання лекавых форм і раслiннай сыравіны ( адвараў і настояў, спіртовых настоек, прыгатаванне эмульсій, настоя з бярозавага грыба чага, чайнага грыба, сокаў, парашку, прыпарак, кампрэсаў і прымочак, лячэбных ваннаў, мазі ), каляндар збору лекавых раслін, тэрміны захавання лекавай сыравіны. Знахарка-аптэкарка расказвае пра прызначэнне розных кветак, траў. Яна ведае магічнае дзеянне кветак, кветкавы гараскоп і можа паведаміць, што вас чакае ў будучым.

На вадзяной акваторыі свята на паверхні вады плаваюць вялікія дэкаратыўныя лілеі, гарлачыкі, рамонкі, званочкі, цюльпаны і інш. ( на аснове аўтамабільных шын ), сярод якіх у кветках або на драўляным плоце сядзяць дзюймовачкі і русалкі ( жывыя або лялькі ). У вячэрні час на вадзяной прасторы пачынаецца светла-вадзяная феерыя (арганізаваная пажарнай часткай і службай светлавога афармлення горада ) ў суправаджэнні класічнай музыкі і піратэхнічных эфектаў.

На свяце працуе " Кабінет касметолага". Для наведвальнікаў кабінета спецыялісты наладжваюць праслухоўванне лекцыі " Кветкі і касметыка ", ў якой раскрываюцца спосабы ўжывання кветак ( бузіны, васілька сіняга, зверабою, каліны, маліны, ліпы, нагаткоў, дзьмухаўца, ружы, рамонку ) з мэтай паляпшэння абменных працэсаў у клетках скуры, барацьбы з заўчасным старэннем, аб іх дэзінфіцуючых, танізуючых і іншых якасцях. Удзельнікі свята маюць магчымасць прайсці тут касметычныя працэдуры для прафілактыкі і лячэння касметычных недахопаў і захавання натуральнай прыгажосці, паслухаць парады па уходу за тварам і целам, аб зборы і захаванні раслiннай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сыравіны, прыгатаванні і прымяненні лячэбных раслінных формаў у хатняй касметыцы. У кабінеце касметолага жадаючыя могуць набыць касметычныя тавары, а таксама атрымаць рэцепты ласьёнаў, мазі, масак, настояў для ванны, прыгатаваных на аснове кветак.

Супрацоўнікі мясцовага фотаатэлье рыхтуюць да свята тантамарэскі "Кветкі жыцця", дзе замест сэрцавіны кветак зроблены прарэзаныя аттуліны, куды жадаючы удзельнік свята можа ўставіць свой твар і атрымаць фотаздамак.

Адной з гандлева-камерцыйных дзей свята з'яўляецца латарэя, ў якой разыгрываюць шыкоўныя букеты садовых кветак, пакаёвыя кветкі ў гаршках, вазы і гаршкі для кветак, кнігі па кветкаводству, вырабы народных раместваў з кветкавай сімволікай ці арнаментыкай, карціны і рэпрадукцыі карцін мастакоў аб кветках, невялікія баначкі меду, касметычныя тавары.

Спецыялізаваым гандлем свята з'яўляецца продаж вырабаў народных раместваў - вышыўкі, ткацтва, выцінанкі, саломапляцення, ганчарных вырабаў, разьбы па дрэву і косьці, чаканкі і коўкі па металу з выявамі і арнаментальнымі узорамі кветак. Тут праводзіцца латарэя народных рамёстваў " Кветкі і творчасць ".

Многіх наведвальнікаў можа прывабіць кафэ " Кветкавы нектар", у якім можна пасмакаваць стравы і напоі, сыравіной для вырабу якіх паслужылі кветкі. Гэтыя стравы і напоі прапануюць афіцыянты ( ў вянках кветак або каронах у выглядзе званочкаў, рамонкаў, пралескаў, ружаў, лілей, гарлачыкаў і іншых кветак ). Стаканчыкі для вады выкананы ў выглядзе званочкаў.

На свяце праводзяць конкурсы на лепшы:

1. букет садовых, палявых і экзатычных кветак;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. выраб экібаны;

3. дэкаратыўнае панно з засушаных кветак і раслін;

4. кветкавую скульптуру;

4. каляровы, альбо чорна-белы фотаздымак кветак;

5. малюнак, альбо карціну з выявамі кветак ;

6. выраб саламянай кветкі і вырабы вышыўкі, ткацтва, выцінанкі з кветкавым арнаментам;

7. верш і песню аб кветках;

8. гульнёвую праграму аб кветках;

9. карнавальны касцюм;

10. мастацкую праграму творчага калектыву аб кветках.

11. мастацкае афармленне гандлёвага пункту;

12. малюнак на асфальце.

13. кандытарскі выраб, напой і страву, састаўной часткай якіх былі кветкі

14. кветкавае афармленне дзяржаўных і прыватных тэрыторый і забудоў.

У рамках конкурсаў праводзіцца дэманстрацыя работ асобных удзельнікаў, сямейных калектываў ( дынастый), навучэнцаў мастацкіх прафесійна-тэхнічных вучылішчаў, дзіцячых студый мастацкай творчасці. У час прагляду конкурсных работ членамі журы мэтазгодна прадугледзіць анкетнае апытванне удзельнікаў свята, папярэднія вынікі якога павінны быць улічаны журы пры вызначэнні пераможцаў. Пасля падвядзення вынікаў конкурсаў на кірмашы адбываецца распродаж экспанаваных і конкурсных вырабаў.

У час работы кірмашу ў эфіры гучаць радыёканцэрты, складзеныя з музычных твораў, легенд, паданняў, вершаў і песень пра кветкі (рэкамендаваны рэпертуар - у дадатку )

11.00. " Сустрэча з кветкамі "

( тэатралізаванае прадстаўленне - ўрачыстае адкрыццё свята )

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пляцоўка відовішч святочна афармлена. Па ўсяму перыметру зоны дзеяння ўсталяваны сцягавыя букеты з намаляванымі на сцягах рознакаляровымі выявамі кветак.

У цэнтры пляцоўкі на зямлі - круглы планшэт-сцэна ( дыяметрам дзесяць метраў), размаляваны па кругу як вянок рознатыпных кветак. Заднікам сцэны з"яўляецца канструкцыя васілька ( два з паловай метры вышынёй ), частка пялёсткаў якога сабраны ў бутон. Па ходу дзеяння бутон павінен раскрывацца. Серцавіна бутона кветкі - пляцовачка дыяметрам адзін метр, на якой стаіць дзяўчынка-Дзюймовачка і ўсталяваны вялікі піратэхнічны фантан.

Паабапал Васілька ўздоўж поля на адлегласці 10 м адна ад другой размешчаны канструкцыі выяў кветак Беларусі - рамонак, званочак, чабор, медуніца, гарлачык, лілея. У серцавіне раскрытых кветак ( вышыня 1 м ) усталяваны малыя піратэхнічныя фантаны. Па краях пляцоўкі відовішч і ў цэнтры - канструкцыі трох піратэхнічных кветак-півоняў ( па пяць малых піратэхнічных фантанаў белага бенгальскага агню ).

Ад цэнтра гасцявой трыбуны да Васілька на полі ўкладзена дарожка са штучных кветак.

11.00. На пляцоўку выходзіць духавы аркестр. Касцюмы музыкантаў - у лістоце і кветках, а на галовах - шапачкі-кветачкі. У выкананні аркестра гучыць папуры на тэмы песень аб кветках.

11.15. Гучыць фанфара беларускіх сурмаў - аркестровая фанаграма ансамбля народна-духавой музыкі " Гуды " БДУ культуры. У гукі фанфар уплятаецца пошчак птушак і мелодыя В. Іванова " Спеў дуброў ". На гэтым фоне - дыктарскі тэкст аб кветках Беларусі і іх ролі ў жыцці чалавека.

11.17. У эфіры - беларуская народная песня:

Ой пайду я лугам, лугам зяляненькім,
А ў лузе цвітуць цвяточкі,
Там дзяўчаты водзяць таночкі....
Многа песень спета пра шчодрае лета,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Толькі Ганначка не спявае,

Ў буйных травах кветкі збірае...

На гэтым фоне дзяўчаты ў беларускіх нацыянальных строях выконваюць харэаграфічную сюіту, у структуры якой : збор кветак, пляценне і упрыгожванне вянкамі, featuresнатыпныя карагоды. У фінале кампазіцыі дзяўчаты становяцца ў " рамонак", у цэнтры якога - хлопчык - "васілёк" са званочкам у руцэ.

11.20. У эфіры гучыць перазвон маленькіх званочкаў і вясёлая цымбальная мелодыя, на фоне якой - дыктарскі тэкст аб свяце, аб"ява аб парадзе ўдзельнікаў свята кветак. Удзельнікі харэаграфічнай сюіты становяцца ўздоўж поля і воплескамі сустракаюць удзельнікаў свята.

11.21. Фанаграма урачыстай мелодыі.На пляцоўку выходзяць удзельнікі парада, на галовах якіх - уборы з выявамі кветак.

Парадак шэсця:

- духавы аркестр ;
- Царыца кветак - "Ружа " ў суправаджнніі маленькіх " бутончыкаў-ружачак ";
- " Бог Апалон" і " гіяцынты ";
- " Рыцары" з вялізарнай кветкай кахання - маргарыткай;
- Турэцкі " гарэм" з цюльпанамі;
- " Русалкі" з гарлачыкамі;
- "Госці з Егіпта" з лотасам;
- " Госці з Японіі " з хрызантэмай;
- " Госці з Кітая" з півоняй;
- " Госці з Францыі" з лілеямі і гваздзікамі;
- " Госці з Расіі" з рамонкамі;
- " Госці з Украіны" з васількамі ".

( усе удзельнікі ідуць з вялізарнымі штучнымі кветкамі )

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Наперадзе кожнай з наступных калон - дзяўчына ў беларускім нацыянальным строі з трафарэтам-эмблемай спецыялізацыі калонны, побач з ёй - кіраўнік дэлегацыі :

- калонна кветкаводаў ( 40 чал.) з кветкамі ў руках;

- калонна пчаляроў ( 40 чал.) у галаўных уборах-сетках;

- калонна эколагаў ( 40 чал.) у адпаведных касцюмах;

- калонна кухараў ( 40 чал.) у высокіх кухарскіх шапках з вялізным тортам-кветкай, які вязуць на калясцы;

- калонна фармацэптаў ( 40 чал. ) у белых халатах;

- калонна удзельнікаў творчых калектываў.

Пра ходу дзеяння дыктар прадстаўляе удзельнікаў парада, расказвае аб іх ролі у папулярызацыі, захоўванні, вырошчванні і выкарыстанні кветак і кветкавых раслін.

Пасля праходу перад глядачамі " госці-кветкі " становяцца ў поўкола за канструкцыяй васілька, а астатнія удзельнікі - за канструкцыямі кветак Беларусі.

11. 25. Гучыць лёгкая, празрыстая мелодыя. Дыктарскі тэкст аб прыбыцці на свята багіні раслін і кветак - Флоры. На пляцоўку на кані ( упрыгожаным

квяцістай папонай і кветкамі ў грыве і хвасце ) выязджае багіня расліннасці. Каня вядзе лесавік - ахоўнік леса. За багіняй ідуць удзельнікі зялёных святак Беларусі ( абрад " Сёмуха" з бярозавымі галінкамі ў руках, абрад " Куст" ) і удзельнікі купальскага свята з вянкамі з лістоты і кветак і букетамі палявых кветак. Праязджаючы каля гасцявых трыбун і калон удзельнікаў, багіня асыпае ўсіх кветкамі з кошыка, які яна трымае ў руках. Пад"ехаўшы да эстрады, багіня выходзіць да мікрафона. Гучыць віншавальная прамова, у фінале якой Флора пералічвае ганаровых гасцей і просіць іх прыняць у дар кветкавыя вянкі беларускай зямлі - сімвал гонару, любві і павагі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

11.28. У эфіры - фанаграма ўрачыстай музыкі. Дзяўчаты - купальніцы падыходзяць да ганаровых гасцей і кіраўнікоў дэлегацый і творчых калектываў і ускладаюць на іх плечы вяночкі.

11.30. Флора гаворыць аб тым, што горад - ініцыятар свята старанна рыхтаваўся да свята прыгажосці, што кожная арганізацыя, прадпрыемства, установа падрыхтавала да свята скульптурную кампазіцыю з кветак.

І зараз удзельнікі і госці свята пабачаць плён творчай фантазіі жыхароў горада.

11.31. На фоне фанаграмы рытмічнай мелодыі па пляцоўцы праязджаюць аўтамабілі, на якіх на аснове дротавых, драўляных ці земляных каркасаў, увітых зелянінай і кветкамі, ці абстаўленых яшчыкамі з жывымі кветкамі,

ўвасоблены розныя кампазіцыі, напрыклад, контуры карты Беларусі, Дзяржыўныя Сцяг і Герб, трактар, аўтамабілі МАЗ, БЕЛАЗ, птушкі, зверы і да т.п., усё, што падкажа ўвасабіцелям іх фантазія. Праехаўшы круг, аўтамабілі спыняюцца ўздоўж усяго поля за канструкцыяй Васілька ( затым яны стануць экспанатамі выставы кветкавых кампазіцый і скульптур ).

11.34. Флора запрашае на пляцоўку старшыню райвыканкама..

Пад музыку старшыня райвыканкама праз " дарогу кветак" праходзіць да мікрафона. Ён віншуе ўсіх са святам прыгажосці, расказвае аб яго удзельніках і іх поспехах. У канцы прамовы старшыня райвыканкама гаворыць аб тым, што кветкі заўсёды былі удзельнікамі рытуалаў грамадзянскай абраднасці беларусаў і што сёння, ушаноўваючы памяць продкаў, мы адпраўляем кветкавыя гірлянды і карзіны да памятных мясцін горада

( пералічвае месцы ўскладання кветак).

11.37. Гучыць фанаграма ўрачыстай мелодыі і вершы аб памяці. На адкрытых аўтамабілях УАЗ юнакі і дзяўчаты ў беларускіх нацыянальных строях з гірляндамі і карзінамі кветак праязджаюць каля гасцявых трыбун і адпраўляюцца па памятным мясцінам на рытуал ускладання кветак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

11.40. У эфіры - звонкая, вясёлая дзіцячая мелодыя. На полі - 200 школьнікаў малодшага школьнага ўзросту з уборамі-кветачкамі на галаве і маленькімі нераскрытымі парасончыкамі ў руках.

Пачынаецца дзіцячая харэаграфічная сюіта, у час якой дзеці раскрываюць парасончыкі, на якіх наклеены папяровыя пялёсткі розных кветак - і ўсё поле ператвараецца ў кветкавы луг. На поле выбягаюць дзеці з " пчолкамі", " матылькамі " і " жукамі " ў руках ( на дротавай аснове ), яны

" апыляюць" кветкі, поле кветак хвалюецца пад лёгкімі парывамі ветрыка - паточныя рухі удзельнікаў, "кветкі" ствараюць на полі многафігурныя рознакаляровыя пабудовы. У фінале кампазіцыі ўсе дзеці збіраюцца ў многаслойную " вазу" вакол канструкцыі васілька.

" Бутон " васілька раскрываецца і адкрывае маленькую дзяўчынку, якая стаіць на сэрцавіне кветкі. Дзяўчынка чытае вершы аб кветках, жадае гораду расці і квітнець, быць прыгожым як кветка, адорваць людзей нектарам сваёй творчасці і просіць старшыню аргкамітэта як знак гэтых пажаданняў прыняць ад удзельнікаў свята папараць-кветку - сімвал надзеі і шчасця.

11.44. На фоне дзіцячай мелодыі дзяўчынка спускаецца з канструкцыі васілька, падыходзіць да старшыні аргкамітэта і ўручае яму прапараць-кветку.

11.45. Гучаць урачыстыя фанфары. Старшыня аргкамітэта віншуе ўсіх са

святам, прадстаўляе старшынь журы розных конкурсаў і аб"яўляе свята адкрытым.

На фоне ўрачыстай мелодыі пачынаецца піратэхнічнае дзеянне. Па чарзе запальваюцца: вялікі фантан канструкцыі васілька, шэсць малых фантанаў канструкцый рамонка, званочка, чабора, лілеі, мядуніцы, гарлачыка і дзве піратэхнічных кветкі-півоні ( фантаны тытанавага саставу, белага бенгальскага агню ).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

11.46. Багіня расліннасці Флора аб"яўляе, што ўдзельнікаў свята віншуе царыца кветак Роза. Гучыць музыка. На сцэне - фрагмент з балета, які выконвае ( адна, ці ў пары ) царыца кветак. У фінале сцэны з балета на полі пачынае дзейнічаць фантанна-вадзяны комплекс рознафігурных струменьчыкаў, створаны пры дапамозе пажарных машын.

11.50. Багіня расліннасці аб"яўляе вальс кветак. Гучыць вальс кветак з балета П.І.Чайкоўскага " Шчаўкунчык ". На сцэне - ансамбль бальнага танца з квекткавымі ўборамі на галовах, а на полі - удзельнікі свята выконваюць вальс. У фінале вальса у неба з пнеўматычных пушак вылятаюць россыпы канфецці, серпанціна і маленькіх каляровых кветачак.

11.55. Флора агалошвае праграму свята і запрашае ўсіх гасцей і удзельнікаў у падарожжа па краіне кветак.

Гучыць фанаграма рытмічнай музыкі. Удзельнікі парада разходзяцца па пляцоўках святочнага дзеняння. Ганаровыя госці разам са старшынёй аргкамітэта здзяйсняюць абход розных святочных пляцовак, дзе пасля іх прыбыцця адбываеца рытуал сустрэчы гасцей і пачатак работы пляцоўкі.

" СЯРОД КВЕТАК "

( АЛІМПІЯДА ЗНАЎЦАЎ КВЕТАК ).

Тэатралізаваная пазнавальна-забаўляльная праграма эрудытаў - знаўцаў кветкавых раслін пабудавана на конкурсах і гульнёвых выпрабаваннях, паядноўваючых Індывідуальныя і калектыўныя намаганні удзельнікаў.

Мэта праграмы - выяўленне ведаў, навыкаў і уменняў удзельнікаў алімпіяды ў свеце кветкавых раслін.

У праграме удзельнічаюць сем каманд школ раёна ( вучні 5 - 10 класаў).

Каманда складаецца з 10 удзельнікаў - пяць хлопцаў і пяць дзяўчат, у лік якіх уваходзяць знаўцы батанікі, гісторыі, фальклярыстыкі, геральдыкі, літаратуры і мастацтва. Кожную каманду ўзначальвае капітан - выкладчык батанікі, а таксама прадстаўнік дырэкцыі школы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

( у другім варыянце каманды могуць ствараццa арганізацыямі і прадпрыемствамі горада або студэнцкімі калектывамі )

Кожная каманда вырабляе для сваіх удзельнікаў галаўныя уборы з кветкай - сімвалам каманды.

На алімпіяду каманда рыхтуе тэатралізаванае прывітанне працягам 3 мінуты ( дзе прадстаўляе сваю кветку ), творчыя нумары, звязаныя з кветкамі ў намінацыях " вусна-паэтычная творчасць", " верш ". " песня",

" танец ". " гульня ", прымаўкі і прыказкі аб кветках, астатнія дзеі алімпіяды будуць праводзіцца ў форме конкурсаў і гульняў.

Пляцоўка дзеяння аформлена ў форме кветкі, серцавінай якой з"яўляецца сцэна, з двух бакоў якой, пачынаючы ад сярэдзіны круга , размешчаны

" пялёсткі", акаймлёныя крэсламі для каманд ( 10 крэслаў для удзельнікаў і два - для кіраўнікоў каманды ).

Заднікам сцэны з"яўляецца вялізны дэкарыраваны вянок кветак беларускай зямлі, ў які ўстаўлена рознакаляровая электрагірлянда, і вянок у час правільных адказаў удзельнікаў можа зіхацець і пераліваццa рознакаляровымі агнямі. У вянку сярод розных кветак сем васількоў ( па ліку

каманд ), на серцавіне якіх прымацаваны лісточкі з заданнямі і рамонак, на пялёстках якога - надпісы заданняў для каманд. Унізе вянка - сем дэкаратыўных дубовых лісцікаў, ззаду якіх напісаны пытанні конкурса знаўцаў геральдыкі. Наверсе вянка - белы гарлачык, у серцавіне якога - малы піратэхнічны фантан, які будзе запалены ў фінале алімпіяды ў гонар каманды-пераможцы. Серцавіна вянка - белы экран , на якім будуць праэцыраваць слайды і відэафільмы.

Гучыць музыка. На экране - відэафільм аб кветках , дэманстрацыя якога завяршаецца выявай вянка. На сцэне з"яўляецца Дзед - Усевед.

Дзед-Усевед: Добры дзень, дарагія сябры ! Вось, нарэшце, і прышло яно, свята кветак, якога ўсе мы так доўга чакалі. Я - Дзед-Усевед, таксама

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рыхтаваўся да гэтага свята, каб прынесці вам радасць сустрэчы з прыгожым і чароўным светам кветкавых раслін.

( на экране - слайды розных кветкавых раслін - травяністыя расліны, кусты, дрэвы )

Мноства раслін жыве ў лугах, лясах, стэпах, бязводных пустынях, багністых балотах. Расліны узбагачаюць паветра кіслародам, неабходны для дыхання амаль што ўсіх жывых істот, і паглынаюць з паветра вуглекіслы газ. Расліны служаць ежай для чалавека і жывёл, сыравінай для розных галін прамысловасці, для прыгатавання лекаў, будаўнічага матэрыяла, паліва, кандытарскіх вырабаў, касметыкі... Але расліны карысны не толькі тым, што даюць ежу і сыравіну, яны упрыгожваюць наша жыццё, прыносяць радасць.

Сёння гаспадарчая дзейнасць чалавека так моцна ўздзейнічае на прыроду, што многія віды раслін зусім зніклі, а многіе знаходзяцца пад пагрозай вымірання. Захаваць іх - наш агульны абавязак. А для гэтага неабходна ведаць як кветкавыя арганізмы жывуць і што яны значаць у жыцці чалавека. ( Дэманстрацыя слайдаў прыпыняецца ).

Сёння беларускае свята кветак на сваю алімпіяду сабрала знаўцаў кветкавых раслін з розных мясцін. Паглядзіце ў зал - і вы пабачыце сапраўднае кветкавае багацце Беларусі. На галовах удзельнікаў каманд - шапачкі-рамонкі, васількі, дзьмухаўцы, лілеі, гарлачыкі... Сем каманд, якія сёння будуць аспрэчваць званне " Знаўца кветак ". У кожнай камандзе па 10 удзельнікаў, якія выявяць свае веды і уменні ў гісторыі, батаніке,

геральдыке, раскрыюць многія цікавыя факты з жыцця кветкавых раслін.

Я прашу каманды павіншаваць сваіх супернікаў дружнымі воплескамі.

( Усе апладыруюць, гучыць фанфара ).

Нашу алімпіяду будзе судзіць кампетэнтнае журы ў складзе:

- старшыня журы - ( называе рэгаліі і ініцыялы старшыні журы);
- батанік -
- гісторык -
- фальклярыст -

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- паэт -

- кампазітар -

- культарганізатар -

Кожны з членаў журы будзе судзіць свой конкурс. За кожны правільны адказ ці выкананае заданне удзельнікі атрымаюць прызавыя жэтоны- васількі. Якая каманда збярэ большую колькасць васількоў - тая і пераможа!

Паважаныя суддзі ! А зараз прыміце ў дар ад удзельнікаў Алімпіяды кветкі - сімвалы кожнай каманды !

( Гучыць музыка. Капітаны каманд падыходзяць да століка журы і ўсталёўваюць у крышталёвую вазу кветкі - сімвалы каманд ).

Дзед - Усевед: Мы пачынаем прадстаўленне каманд. Кожная каманда падрыхтавала тэатралізаванае прывітанне, ў якім раскажа аб сваёй кветцы.

( У эфіры - музыка. На сцэну па чарзе запрашаюцца каманды, якія ў песнях, вершах, танцах прадстаўляюць сваю кветку ).

Ну вось і закончылася прадстаўленне каманд і мы пачынаем наша турнірнае спаборніцтва размінкай. А размінка - гэта аукцыён кветак !

Я паказваю літару, а каманды адказваюць. Якая каманда апошняй назаве кветку на паказаную літару, тая і атрымае прызавы васілёк. Ітак, літара " А "...

( Каманды ўдзельнічаюць у аукцыёне, называючы кветкі на ўсе літары алфавіта, за кожны пераможны адказ атрымліваючы прызавы жэтон ).

А зараз я выклікаю на сцэну батанікаў каманд ! Усе удзельнікі вітаюць свайго знаўцу кветак дружнымі воплескамі і скандзірваннем слова " віват ".

( Пад музыку і воплескі прадстаўнікі каманд выходзяць на сцэну ).

Дзед-Усевед: Я прашу знаўцаў батанікі падыйсці да вянка і ўзяць заданні, якія ляжаць на сэрцавіне васількоў. ( Удзельнікі каманд бяруць паперкі з заданнямі. Пытанні - з падручніка батанікі для 5 - 6 класаў сярэдняй школы )

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На кожнай паперцы напісана пытаннне, на якое вы павінны даць адказ. На падрыхтоўку вам даецца тры хвіліны . Час пайшоў !

( Гучыць музыка, удзельнікі рыхтуюцца да адказу. Заданні для батанікаў наступнага зместу:

1. Назавіце органы кветкавых раслін. ( корань, сцябліна, ліст, кветка ).

2. Назавіце групы кветвавых раслін. ( Травы і травяністыя расліны, кусты, дрэвы ).

3. Якія састаўныя часткі мае кветка ? ( кветканожка, кветкаложа, чашалістнік, завязь, слупік, песцік, тычынка, рыльца, пялёсткі ).

4. Назавіце віды сакавітых і сухіх пладоў кветкавых раслін. ( Сакавітыя плады - ягада і касцянка, сухія - насенне, зярноўка, боб, стручок, карабачка ).

5. Назавіце пабудову расліннай кветкі. ( абалонка, поры, цытаплазма і вакуолі - пустыя месцы, запоўненыя кветкавым сокам ).

6. Назавіце знешнюю пабудову кветкавых лісцеў і іх адрозненне. ( лісты маюць ліставую пласцінку і чарэшку, розніца - ў размяшчэнні жылак на лісце, якое можа быць паралельным, дугавым, сеткавым ).

7. Суквецце - група кветак, размешчаных блізка адна ад адной у пэўным парадку. Назавіце віды суквеццяў. ( Кісць - ландыш, чаромха; просты колас - падарожнік; складаны колас - жыта, пшаніца, ячмень; просты парасон - прымула, вішня; складаны парасон - пятрушка, морква; карзінка - дзьмухавец ).

Дзед- Усевед: Пакуль батанікі рыхтуюцца да адказаў, я кожнай камандзе па чарзе буду зачытваюць вершаваную загадку, звязаную з пэўнай кветкай, ці кветкавай раслінай, а каманда - адказваць. На роздум - 10 секунд. Каманда, якая своечасова адкажа - атрымае прызавы васілёк. Калі каманда не зможа адказаць - у конкурс уключаюцца іншыя каманды, якія, пры ўмове разгадкі атрымаюць прызавы рамонак замест няўдалай каманды.

( На фоне музыкі гучаць загадкі:

1. Цвітуць і на лузе, і ў полі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Чырвоныя, белыя шапкі
І дараць турботлівым пчолам
Нектар і салодкі, і пахкі. ( Канюшына )

2. Хвалюе водарам,
Красою,
Але няпроста
Ўзяць рукою.
Галава - пахучая,
Тулава - калючае. ( Ружа )

3. На сцяблінках тонкіх
Вісяць званочкаў гронкі -
Белыя, духмяныя,
У тугіх лістах схаваныя. ( Ландыш )

4. Мною дзяўчынак называюць,
А як толькі зацвітаю -
З гудам рупным і вясёлым
Да мяне лятаюць пчолы. ( Ліпа )

5. Выраслі ў полі браточкі
І зазванілі ў званочкі:
Жніце нас і малаціце,
Дзеткам пячэнне рабіце. ( Авёс )

6. На сцяблінку сонца села -
Белы капялюш адзела. ( Рамонак )

7. Гарачае лета,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спеюць суніцы,

А ён -

У пуховай хусцінцы. ( Адуванчык )

( У праграму конкурса загадак можна ўключыць і іншыя - больш складаныя або больш простыя вершаваныя, ці празаічныя загадкі.

Дзед-Усевед аб"яўляе вынікі конкурса загадак і выклікае знаўцаў батанікі для адказу на пытанні ).

Дзед- Усевед: Конкурс батанікаў у нас будзе ацэньваць вянок кветак. Ён у нас незвычайны, чароўны ! Калі удзельнік зробіць правільны адказ - вянок зазіхаціць агеньчыкамі і удзельнік атрымае прызавы жэтон-васілёк. Ітак, мы пачынаем конкурс ! ( гучыць музыка, удзельнікі адказваюць на пытанні, журы падводзіць вынікі конкурса ).

А зараз мы збіраемся ў вандроўку і возьмем з собай у дарогу наш чароўны вянок. Дапусцім, што ўсё неабходнае для вандроўкі па прыродзе - рэчмяшок, турысцкія прыналежнасці ну і, канешне, бутэрброды вы прыгатавалі. Але ўсё гэта яшчэ не гарантуе поспеху вандроўкі. Галоўнае - надвор"е: калі будзе дождж або халодны вецер - гэта значна горш, чым сонечны дзянёк. Вядома, што пра надвор"е можна даведацца з газеты, ці з прагнозу па радыё і тэлебачанні, альбо па барометры, калі ён ёсць у цябе дома, ён таксама прадказвае надвор"е. А можна зрабіць значна прасцей: прыглядзецца да навакольнай прыроды, ў прыватнасці, да кветак. Яны - самыя лепшыя барометры і яны безпамылкова прадкажуць табе, якое будзе надвор"е. Возьмем канюшыну. Калі яе кветкі - шышачкі сціснуліся і схіліліся да зямлі - ведай : абавязкова будзе дождж. А калі яны весела паднялі галоўкі, пялёсткі распраўіліся і ласкава шэлясцяць на пяшчотным ветрыку - смела адпраўляйся ў паход: дзень будзе ясны і сонечны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А хто падкажа, якія кветкі перад дажджом закрываюць пялёсткі ? ( ружа, мальва, цюльпан, фіялка, дзьмухавец, нагаткі, цыкорый, бярозка палявая, іпамелія, календула і макрыца ).

А якія кветкі адкрываюцца перад непагаддзю і не скручваюцца перад дажджом нават нанач ? ( акацыя, чырвоная канюшына, зайцава капуста ).

Многія кветкі перад дажджом пачынаюць моцна пахнуць, выдзяляць многа нектару і вакол іх роем лятаюць пчолы. Назавіце гэтыя кветкі .

( мята, язмін, ліпа, бружмеля )

Частка кветкавых раслін перад дажджом пачынае " плакаць", т.е. на лістах з"яўляюцца кроплі вады. Скажыце, якія кветкі " плачуць " ? ( кона, стрэкаліст, разак, вольха, чаромха, клён, вярба ).

А цяпер падкажыце, суквецці якіх раслін перад дажджом згінаюцца і звісаюць уніз так, што пыльнікі ўсіх кветачак надзейна ахаваны зверху пялёсткамі ? ( чаромха, барбарыс, лаўравішня і інш. )

Ну вось бачыце, як цудоўна вы ведаеце жывы барометр прыроды !

Я прашу тых, хто правільна адказаў , атрымаць прызавы жэтон-рамонак.

( юнак і дзяўчына пад гукі урачыстай музыкі ўручаюць удзельнікам алімпіяды жэтоны-васількі)

Дзед- Усевед: У паходзе мець гадзіннік - гэта цудоўна. Але не бяда, калі ў кагосьці з вас яго не аказалася. Час можна вызначыць пры дапамозе раслін. Яшчэ ў 20-х гадах 18 стагоддзя вядомы шведскі батанік, даследчык прыроды Карл Лінней заўважыў, што тыя ці іншыя кветкі раскрываюць і закрываюць свае пялёсткі ў пэўны час. Назіраючы на працягу многіх гадоў за паводзінамі кветак, вучоны склаў табліцу, дзе пазначыў гадзіны раскрыцця і закрыцця кветак, а затым па гэтай табліцы высадзіў цэлы кветнік, зрабіў " кветкавы гадзіннік", які ён назваў " гадзіннік Флоры".

Паглянуўшы на свой кветнік, Карл Лінней мог лёгка вызначыць час у залежнасці ад таго, якія кветкі ў гэты момант раскрытыя, а якія закрытыя. Таму знаёмства з навакольным светам кветак і іх жыццём лепш пачынаць з самага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

простага - вызначэння назваў відаў раслін і часу іх цвіцення на працягу дня. А гэта і ёсць знаёмства з кветкавым гадзіннікам.Для яго лепш выбраць устойлівы перыяд у сярэдзіне лета, лепш у другой палове чэрвеня. Тады і дзень самы доўгі і рознастайнасць кветак багацейшая.

Кожны з вас таксама можа навучыцца вызначаць час па кветках. Напрыклад, цыкорый раскрывае свае блакітныя кветкі ў 6 - 7 гадзін раніцы,

а закрывае ў 3 - 4 гадзіны дня; званочкі раскрываюць свае пялёсткі ў 7 - 8 гадзін раніцы. Нават кветкі нашай бульбы таксама падказваюць час: раскрываюцца яны ў 7 гадзін раніцы, а закрываюцца ў 2 - 3 гадзіны дня.

Вось зараз мы і паспрабуем скласці кветкавы гадзіннік. Кожная каманда атрымлівае планшэт з назвамі кветак. За тры мінуты удзельнікі разам з кіраўнікамі каманд павінны павінны насупраць кожнай кветкі напісаць мяркуемы час яе раскрыцця і закрыцця. Кветкавы гадзіннік гэта своеасаблівы экзамен як для членаў каманды, так і для яе кіраўнікоў. Каманда, якая больш дакладна выканае заданне, атрымае тры прызавых рамонка. Умовы ўсе зразумелі? Пачынаем ! ( Юнак і дзяўчына раздаюць камандам планшэты. Гучыць музыка - старт конкурса. Каманды пачынаюць выконваць заданне.

На планшэтах кожнай з каманд напісана наступнае:

" Кветкавы гадзіннік "

Назва кветкі час адкрыцця пялёсткаў 1 час закрыцця

____________________( павінны напісаць удзельнікі конкурса )______

1. Казлабарод ( 3 гадзіны 12 гадзін )
2. Цыкорый ( 4 гадзіны 13 гадзін )
3. Дзьмухавец, пунцовая
Ружа ( 5 гадзін 14 гадзін )
4. Шыпшына ( 5 гадзін 20 гадзін )
5. Асот ( 5 гадзін 13 гадзін )
6. Дзьмухавец, бульба ( 6-7 гадзін 14 гадзін )

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

7. Кап"ялісты каганец ( 6-7 гадзін 15 гадзін )

8. Наготкі ( 6-7 гадзін 16 гадзін )

9. Цыкорый,

званочкі, белы гарлачык ( 6-7 гадзін 15-16 гадзін)

10. Парасоністы ястрабок ( 6-7 гадзін 17 гадзін) 11. Макрыца ( 9 гадзін 17 гадзін)

12. Казялец ( 10 гадзін 18 гадзін )

13. Мак ( 10 гадзін 19 гадзін)

14. Кісліца ( 10 гадзін 19 гадзін)

15. Свінакроп ( 11 гадзін 16 гадзін)

16. Хрусталёвая траўка ( 12 гадзін 19 гадзін)

17. Пахучая табака ( 20 гадзін на світанку )

Дзед-Усевед ( пасля заканчэння конкурса): Ну вось мы і склалі кветкавы гадзіннік. Зараз нашае журы азнаёміцца з вашымі работамі і вызначыць лепшую каманду або каманды,якія атрымаюць тры прызавых рамонка.

А мы з вамі працягваем нашу вандроўку! ( гучыць мелодыя беларускага народнага танца " бульба". На сцэне - танец у выкананнні харэаграфічнага калектыву. У фінале танца дзяўчаты ствараюць " бульбяное поле" ).

Дзед-Усевед: Мы з вамі праходзім праз бульбяное поле. У нас час вас будуць лічыць дзіваком, калі вы падорыце каму-небудзь букет з кветак бульбы. А ў 17 стагоддзі такія букеты лічылі шыкоўнымі. Сціплымі фіялетавымі або ружовымі кветкамі бульбы упрыгожвалі прычоскі каралеў і камзолы прыдворных. Радзіма бульбу - узбярэжжа Чылі і горы Перу. Бульба добра вытрымлівала марозы высакагорных раёнаў. Еўрапейцы не ведалі бульбы да 1565 года, т.е. да наведвання Паўднёвай Амерыкі іспанцамі. У Еўропе бульбу спачатку вырошчвалі як дэкаратыўную расліну, якой упрыгожвалі клумбы. У Беларусі бульба з"явілася ў 18 стагоддзі і заваявала такую папулярнасць, што яе ў нас называюць " другім хлебам ".

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А цяпер адкажыце на пытанні:

1. Да якога сямейства раслін належыць кветка бульбы ?

( да паслёнавых)

2. Ці ёсць нектар у кветак бульбы ?

3. Якім спосабам адбываецца апыленне бульбы ? ( самаапыленне )

4. Як размножваюць бульбу ? ( вегетатыўным спосабам, клубнямі )

А цяпер тых, хто правільна адказаў на пытанні, я прашу атрымаць прызавы рамонак і пакецікі смажанай бульбы!

( Гучыць мелолдыя " Бульбы ", удзельніцы харэаграфічнага калектыву падносяць канкурсантам жэтоны і пакецікі з бульбай )

Дзед- Усевед: А мы працягваем наша падарожжа. Мы прайшлі з вамі луг і лес і вы заўважылі,што вакол раслін заўсёды многа насякомых ? І ў гэтым нічога дзіўнага, бо яны ядзяць лісты раслін. Але, аказваецца, і ліст можа з"есці мошку. У свеце ёсць больш 400 раслін-канібалаў, якія харчуюцца насякомымі. Страшэннымі драпежнікамі з"яўляюцца расліны-гарлачыкі Мадагаскара, паўднёвага Кітая, паўночнай Аўстраліі. На балотах Атлантычнага ўзбярэжжа Паўночнай Амерыкі сустракаецца расліна дарлінгтонія з лоўчымі апаратамі, дасягаючымі рэкорднай для раслін-драпежнікаў вялічыні - аднаго метра!

Папаўшы ў купал гарлачыка, насякомае доўга б"ецца, шукаючы выхаду, але

ўрэшце, падае на дно пасткі і пераварваецца раслінай.

Ёсць такія расліны і ў нас, у Беларусі. На глебах старых тарфяных балот

сярод мхоў, тонкіх галіначак клюквы і лёгкіх шарыкаў пушыцы можна пабачыць беленькія кветачкі расліны-паляўнічага. Кожны яе лісточак пакрыты чырвонакрававымі валаскамі, а на кончыках лісточкаў, быццам чыстая раса, б"ецца капелька. Садзіцца на ліст расліны камар, а на лістку не прахалодная раса, а ліпкая слізь. Валаскі ліста пачынаюць згінацца, кранаючыся камара і выдзяляюць пякучы сок. Пад яго ўздзеяннем праз дзень-два камар

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

раствараецца і ўсмактваецца лістом. Цяпер кустік зусім сухі, але неўзабаве пачнецца новае паляванне. Ад гэтай капелькі на лісту расліна і атрымала трапную назву. Як называаецца гэта расліна ?... Правільна, расянка ! Я прашу удзельніка,які верна адказаў на пытанне, атрымаць прызавы жэтон-васілёк ( Гучыць музыка, юнак уручае удзельніку прызавы васілёк).

Расянка з"яўляецца і лячэбным срокам. Яе выкарыстоўваюць пры прастудных захворваннях, у якасці потагоннага сродка.

У нашай краіне ёсць і іншыя зялёныя расліны-паляўнічыя. Назавіце іх !

( вянерына мухалоўка, альдраванда, жыранка . Удзельнікі, зрабіўныя правільны адказ, атрымліваюць прызавы васілёк ).

Дзед-Усевед: А зараз мы зробім прывал. Адпачнем, паядзім маліны, яблык і раскрыем кнігу прыроды...( раскрывае кнігу) і ... зробім падарожжа па гісторыі кветкавых раслін розных часоў і народаў. На першай старонцы гісторыі - старажытны Усход.

(Гучыць усходняя музыка. На сцэне дзяўчаты выконваюць усходні танец з кветкавымі галінкамі розных дрэў. На экране - вісячыя сады Семіраміды ).

Адно з сямі цудаў света - вісячыя сады Семіраміды, якія былі створаны ў шостым стагоддзі да новай эры па загаду цара Навуходаносара.

Гэты цар пабудаваў палац на штучна створанай пляцоўцы, паднятай на вышыню шасціпавярховага дома. Да пляцоўкі уступамі падымаліся шэсць радоў цагляных арак - шэсць аркад. На кожным уступе быў насыпаны слой зямлі і разведзены квітнеючы сад. Дзень і ноч сотні рабоў вярцелі вялізарныя калёсы, падаваючы ў вісячыя сады ваду ракі Еўфрат. Квітнеючыя вісячыя сады Семіраміды - гэта адзін з цудоўных твораў чалавечага розума і ўмелых рук. А знаходзіліся квітнеючыя вісячыя сады ў самым вялікім і багатым горадзе Старажытнага Ўсходу. Як называўся гэты горад ? ... Правільна, Вавілон! Атрымайце прызавую кветку. ( дзяўчына ўручае кветку правільна адказаўшай камандзе ).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзед-Усевед ( гартаючы кнігу): У сёмым стагоддзі Егіпет стаў месцам кахання двух пануючых асоб - царыцы Клеапатры і рымскага консула Марка Антонія....

( гучыць егіпецкая мелодыя, на сцэну выходзяць Клеапатра і служанка, якая выносіць стодік з фруктамі і віном )

Клеапатра: Сёння прыедзе Марк Антоній, ў яго гонар у гэтай зале я наладжу пір, таму ўсю падлогу я загадваю пакрыць шоўкам і пялёсткамі маіх любімых кветак.

Служанка: Але гэта будзе каштаваць вялізныя грошы ....

Клеапатра: Нічога, гэта будзе проста шыкоўна і Марку ўсё спадабаецца.

Служанка: Клеапатра, Маркам Антоніям авалодала незвычайная падазронасць, як ты зможаш пераканаць яго ў шчырасці свайго кахання ?

Клеапатра: Я загадала атруіць ядам маёй любімай кветкі вянок і калі мы будзем піць віно, я змагу даказаць яму сваё каханне.

( Яны уходзяць, цікае гадзіннік, гучаць парадныя трубы і голас: " Консул Рыма Марк Антоній ! " На сцэну выходзяць Антоній і Клеапатра і слуга. Гучыць музыка. )

Клеапатра: Вітаю цябе, Марк Антоній, вітаю гонар Рыма і маё каханне !

Антоній: Я таксама кахаю, але не веру табе, Клеапатра ! Увесь Рым гаворыць аб тваім вераломстве і жаданні атруціць мяне.

Клеапатра: Любы, маё каханне да цябе чыстае, як кропля ранішняй расы,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

як пацалунак дзіцяці, як сок гэтай гронкі вінаграду. Пакаштуй і ты перакаешся !

Антоній: Я не пачну пір, пакуль слуга не адведае ўсе стравы

Клеапатра: Юлій, адведай царскія стравы !

( Слуга каштуе вінаград, печыва, віно... Пауза )

Антоній: Я згодзен раздзяліць з табой застолле.

( Клепатра і Антоній падыходзяць да стала, усаджваюцца, Клеапатра маша платком, на сцэне - танец егіпецкіх танцорак, у час якога Клеапатра і Антоній пьюць віно, каштуюць стравы. Пасля танца танцоўшчыцы убягаюць за сцэну, Антоній здымае з Клеапатры вянок і сыпле яго лісце у сваю чашу. )

Антоній: Ува мне жыве каханне і рэўнасць, каханне і падазронасць, але я хачу выпіць за цябе, Клепатра !

Клеапатра ( вырываючы з яго рук чашу ): Паглядзі, дарагі Антоній, як я магла лёгка ад цябе пазбавіцца, калі б толькі я магла без цябе жыць ! Юлій ! падыйдзі і адведай віна ! ( Слуга падыходзіць, выпівае віно і валіцца на падлогу. )

Антоній: Ты... ты... выратавала маё жыццё! Ты - сама вернасць і шчырасць, бо ты пераканала мяне, што каханне застаецца жыць !

( усе персанажы застываюць у стоп-кадры )

Дзед-Усевед: Вось такі факт з гісторыі кветак ... Аб чым ён гаворыць - думайце самі, але вось якое пытанне: як называліся любімыя кветкі Клеапатры, якімі яна загадала пакрыць падлогу і сокам якіх атруіла вянок?

( ружы ).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сапраўды, гэта ружа ! Першыя звесткі аб ружы мы знаходзім у старажытнаіндускіх паданнях, дзе яе з"яўленне звязваюць з богам Вішну. У Персіі ружа атрымала такую любоў і распаўсюджанасць, што ў паэтаў краіна атрымала назву " Гулістран " - сад руж. Краінай руж называюць Балгарыю, дзе з іх рыхтуюць ружовае масла. А ў Англіі 15-га стагоддзя паміж дынастыямі Ланкастэраў і Йоркаў 30 гадоў доўжылася барацьба за каралеўскую ўладу. Знаўцы гісторыі, адкажыце, як называлася гэта вайна ?...

( удзельнікі адказваюць )

Правільна, вайна Алай і Белай ружы, якія былі сімваламі гэтых дынастый.

Атрымайце прызавыя рамонкі! ( пад музыку удзельнікі атрымліваюць жэтоны-рамонкі)

Дзед-Усевед: Мы гартаем далей нашу кнігу прыроды... і пераносімся ў Францыю ( чытае): " У 12 -м стагоддзі на прасторах малой Азіі разгарнулася жорсткая барацьба паміж туркамі і хрысціянамі Еўропы за гроб Ісуса Хрыста, які знаходзіўся у Іерусаліме...Важную ролю ў гэтай барацьбе іграла Францыя...

( гучыць сярэднявечная музыка, на сцэне з"яўляюцца некалькі прыдворных і мажоржом французскага двара. Ён тройчы стукае трасцяной палкай па падлозе ).

Мажордом: Яго вялікасць, кароль Францыі Людовік Семы !

(пад музыку на сцэне з"яуляецца кароль, прыдворныя робяць паклон )

Людовік: Я сабраў усіх вас, каб паведаміць маё канчатковае рашэнне. Мы будзем удзельнічаць у другім крыжовым паходзе супраць мусульман. Герцаг Анжуйскі, вы былі з пасольскай місіяй у розных краінах. Аб чым вы дамовіліся ?

Герцаг: Рымскі Папа даў сваё высокае блаславенне. У паход ідзе ўвесь хрысціянскі свет. Лепшыя ў свеце швейцарскія лучнікі, рыцары

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Англіі,Саксоніі, Іспаніі і Італіі - гэта вялікая сіла !... Генуэскія купцы перавязуць войска праз Міжземнае мора на сваіх караблях за невялікія грошы. З піратамі Сіцыліі і Італіі ёсць дамоўленасць, што яны не будуць нападаць на нашы караблі.

Людовік: Гэта ўсё добра, але я настойваў і настойваю, каб мы выступілі ў паход асобным атрадам.

Герцаг: На гэта згодны ўсе манархі, але яны патрабуюць, каб па звычаях нашага часу вы, як начальнік асобнага атрада, выбралі для размяшчэння на сваім сцяге сімвалічную эмблему і давялі гэта да ведама ўсіх.

Людовік( у роздуме ): Майму продку, каралю Хлодвігу бог ужо падараваў кветку, якую ён усталяваў на сваім сцязе, перамог ворагаў хрысціянства і стаў заснавальнікам французскай нацыі. Гэта кветка - яго баявы запавет. (Рашуча ) Залатым колерам тройчы яна будзе ззяць на маім белым сцяге, напамінаючы воінам пра подзвіг гасудара, які выгнаў з Айчыны рымлян. Белы сцяг ! Белы сцяг і тры кветкі прынясуць нам перамогу над няверымі ! У паход !

( Гучыць музыка, персанажы пакідаюць сцэну )

Дзед - Усевед: Тры кветкі... У далейшым яны сталі эмблемай каралеўскай улады і вернасці папскаму прастолу. Як называлася гэтая кветка ?

( удзельнікі адказваюць ) Правільна, лілея ! Я прашу пад гукі старадаўняй французскай мелодыі уручыць прызавыя васількі тым, хто адказаў на пытанне ( пад музыку жэтон-васілёк перадаецца удзельнікам віктарыны )

Дзед-Усевед ( гартаючы кнігу, чытае ): Сярэднія вякі... Па ўсёй Еўропе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

грымяць шчыты і мячы, ламаюцца коп"і на турнірах, дзе рыцары аспрэчваюць свой гонар і славу... Найлепшымі лічыліся штогоднія турніры Іспаніі, дзе сустракаліся лепшыя рыцары Еўропы....

( Гучыць іспанская музыка. На сцэну выносяць два крэслы, да іх выходзяць і усаджваюцца Кароль і Каралева. На сцэну выходзіць герольд з сурмой. Гучаць гукі сурмы. )

Герольд: Пачынаем рыцарскі турнір у гонар імянін каралевы Іспаніі. На бой выклікаюцца два лепшых рыцара хрысціянскага свету - славетны Чорны рыцар з Польшчы і гонар Іспаніі - Залаты рыцар ! Вітаем рыцараў !

( Пад гукі старадаўняй музыкі і воплескі прысутных на сцэну выходзяць рыцары. Яны кланяюцца ва ўсе бакі і падымаюць мячы. На фоне музыкі праходзіць бой рыцараў. У фінале пераможца кланяецца ўсім прысутным, здымае шлем, бярэ ў рукі букет цюльпанаў і становіцца на калена перад каралевай.)

Рыцар: Ваша вялікасць, каралева Ганна ! Па звычаёваму рыцарскаму праву

я выбіраю Вас дамай сэрца і ваш гонар я буду адстойваць, пакуль будзе б"ецца маё сэрца. Прыміце ў дар гэтыя кветкі - сімвал рыцараў і кахання !

( стоп-кадр )

Дзед- Усевед: Прыкладна так праходзілі рыцарскія турніры. Але ў гэтым турніры можна заўважыць прынцыповую памылку. Разгадайце яе ?

( Рыцар падараваў каралеве цюльпаны. А гэта неверна. Кветкамі рыцараў з"яўляюцца маргарыткі, якія дарылі ў час турніраў.)

Гэту складаную загадку вызначыў удзельнік каманды.... Ён атрымлівае два прызавых васілька! ( Пад музыку ідзе перадача жэтона -васілька).

(Дзед-Усевед Раскрывае наступную старонку кнігі ... и гучыць пяшчотная беларуская цымбальная мелодыя ).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзед-Усевед: Ну вось мы і вярнуліся з падарожжа дамоў, у Беларусь. Спякотным чэрвеньскім днём, удыхаючы водар кветак і траў, выйдзіце за ваколіцу вёскі і вы пабачыце, як уздоўж хлебнага поля, то тут, то там запальваюцца пяшчотна-блакітныя або сінія васількі.

Ходзяць на арбіце летнія дзянькі ,
Расквітнелі ў жыце кветкі васількі ,
Вечар ярка зорыць мой любімы кут,
Любы мне падорыць васільковы цуд

І два сэрца млеюць ад гарачых слоў,
На душы квітнеюць горы васількоў,
Кветкі палявыя звяжуцца ў вянок,
Вёсны маладыя косіць Васілёк.

Ой ты, водар ночы, цеплыня рукі,
Васільковы вочы быццам васількі,
Сонна ночка тае аксамітам рос,
Два жыцця сплятае ў адзіны лёс.

Вось такія цудоўныя вершы пра кветку і каханне напісаў беларускі паэт І. Цітавец. Васілёк... любімая кветка беларусаў. У даўнія часы яна была занесена да нас з Заходняй Азіі і стала нашай нацыянальнай кветкай. Васількі з"яўляюцца элементамі арнамента ў народных вышыўках, дзе іх выявы заўсёды бачны з калоссямі жыта, яны ўплецены ў Дзяржаўны Герб Беларусі, васілёк стаў сімвалам нашага свята. Падкажыце, а ў якіх рытуалах і забавах беларускіх народных святаў каляндарнага цыкла васілёк ужываюць у якасці аздаблення абрадавых дзей: на купаллі, дажынках ?...

( Удзельнікі гавораць, што яго ўплячалі ў купальскія вянкі і варажылі аб лёсе, па заканчэнні жніва імі перапляталі дажыначны вянок і сноп і ўрачыста

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

перадавалі гаспадару поля,васількі з жытнімі калоссямі як сімвал ураджаю стаялі у чырвоным кутку кожнай хаты - і атрымліваюць жэтоны-васількі)

Васілёк - цудоўны меданос, ні чмель, ні пчала не мінууюць яго. У даўніну з васілька дабывалі сінюю фарбу і рабілі воцат, адварам яго настоя

лячылі хворыя вочы.

Васілёк - гэта адзіная на славянскай прасторы кветка, якая ў пэўны час становіцца грашовай адзінкай. Пачынаючы з канца XX стагоддзя на адным са святаў Беларусі рэгулярна выпускаюць святочныя грошы - "васількі",

якімі удзельнікі карыстаюцца ў гандлёвых радах нараўне з беларускімі рублямі. У 2003 годзе ЮНЕСКА прызнала гэтае свята лепшым у Еўропе !

Як называецца свята з " васільковымі " грашыма ?.... ( Міжнароднае свята мастацтваў " Славянскі базар у Віцебску " ). Я прашу таго, хто сказаў поўную назву свята, атрымаць прызавы васілёк ! ( Пад музыку удзельнік алімпіяды атрымлівае жэтон-васілёк).

Дзед-Усевед: Паглядзіце, зноў наш чароўны вянок зазіхацеў і пачаў пераліваціца агнямі. Гэта гаворыць пра тое, што ён зноў выходзіць на арэну выпрабаванняў, каб ацэньваць змаганні наступных удзельнікаў.

Вянок - гэта старажытнейшы сімвал узнагароды, гонару. Вянок з зеляніны і кветак ва ўсіх народаў у даўнія часы ужываўся ў час святаў, а таксама ахвярапрынашэнняў як знак саюза паміж нашчадкамі і продкамі, таму на ранняй стадыі ён разглядаўся як сімвал бессмяротнасці.

У антычныя часы вянок ператварыўся ў сімвал узнагароды - ім увенчвалі пераможцаў Алімпійскіх і Немейскіх гульняў, пераможцаў змаганняў у галіне спорта і мастацтва.

У старажытнем Рыме ён стаў сімвалам воінскай доблесці, а ў нашы часы -

састаўной часткай гербаў многіх краін сусвету.

Вянок - гэта сімвал, умоўны знак, таму ён выклікае на сцэну знаўцаў кветкавай геральдыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

( гучыць музыка, знаўцы геральдыкі ўсіх каманд падымаюцца на сцэну і выходзяць да мікрафонаў ).

Паважаныя знаўцы геральдыкі! На нашым вянку вы бачыце сем дубовых лісціка, на адваротнай старане якіх напісаны розныя пытанні па геральдыцы.

Я прашу вас падыйсці да вянка і ўзяць адзін лісцік ( удзельнікі выконваюць заданне). Вам даецца пяць хвілін і за гэты час вы павінны азнаёміцца з пытаннем, падрыхтавацца і даць адказ у час якога зіхаценне вянка будзе азначаць, што вы заваявалі прызавы васілёк для вашай каманды .

( удзельнікі бяруць лісточкі і рыхтуюцца да адказу.

На лісточках дуба напісаны пытанні:

1. Якую кветку кароль Рычард Львінае сэрца зрабіў англійскай эмблемай ?

( Ружу )

2. Гірлянда з якіх раслін у Беларусі стала эмблемай памяці?

( хваёвая гірлянда з кветкамі, перавітая алай стужкай )

3. Ружа якога колеру з"яўляецца гебрам сталіцы Кітая - горада Пекін ?

( Жоўтая ружа )

4. У гербе якой паўночнай краіны - 9 белых руж ? ( Фінляндыя ).

5. Якая дзяржава мае ў сваім гербе нарцыс ? ( Уэльс )

6. Якія кветкі красаваліся на сцягах французскіх каралёў ў сярэднявеччы?

( Тры лілеі. У гэтыя часы саму Францыю называлі царствам лілей, а караля - каралём лілей ).

7. У якой краіне яе сімвалам з"яўляецца 16-ці пялёсткавая хрызантэма?

( Японія )

8. Якая кветка была геральдычным знакам Напалеона ? ( фіялка )

Пры ўмове правільнага адказу ўсіх удзельнікаў дадатковае восьмае пытанне задаецца, каб выявіць пераможцу конкурса ).

Дзед-Усевед: Пакуль нашы знаўцы геральдыкі абдумваюць пытанні, мы з вамі наладзім караоке. Зараз будзе гучаць фанаграма песень аб кветках, а мы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўсе хорам будзем спяваць. Якая каманда будзе спяваць лепш - тая заваюе прызавы васілёк. Пачынаем караоке !

( гучыць музыка, пачынаецца агульнае выкананне песень )

Вы бачыце, замільгацеў наш чароўны вянок, а гэта значыць, што час спеваў скончыўся і мы пачынаем конкурс знаўцаў геральдыкі.

( на сцэне знаўцы геральдыкі адказваюць на пытанні, у час правільных адказаў пераліваецца рознакаляровымі агеньчыкамі вянок, журы падводзіць вынікі конкурса геральдыкі і караоке ).

Дзед-Усевед: Гартаючы старонкі кнігі прыроды, мы заўважылі, што на свеце многа краін адзначаюць свята кветак. Напрыклад, у Японіі ў лютым месяцы святкуецца квіценне сліў, у сакавіку - персікаў, у красавіку - вішань, у маі - вістарыі, у чэрвені - півоняў, а ў кастрычніку - хрызантэм. У вёсках Францыі дагэтуль у першую майскую нядзелю спраўляюць свята ландыша - кветкі з незвычайна прыемным водарам, снежна-белыя званочкі якога спяваюць пераможны гімн вясны. У гэты дзень сабранымі ў лесе ландышамі - сімваламі вясны - людзі ўпрыгожваюць вокны, каміны і сталы, ў застоллі спяваюць песні ў гонар ландыша і , нарэшце, збіраюцца на танцы, дзе хлопцы запрашаюць дзяўчат у танок і, калі дзяўчына згодна правесці з ім ўвесь вечар, яна дорыць яму букецік ландышу.

Давайце ўявім сабе, што мы знаходзімся ў французскай вёсцы на свяце ландыша. Наша сцена і зал - гэта танцавальная пляцоўка. Зараз пачне гучаць музыка і хлопцы пачнуць запрашаць дзяўчат сваёй каманды на танцы. Якая каманда выставіць на пляцоўку больш танцораў і будзе лепш за іншых танчыць - тая атрымае прызавы васілёк.

Пачынаем французскую вечарыну ландыша !

( гучіць кампазіцыя французскіх мелодый: танга-вальс-факстрот, сцена ператвараецца ў танцавальную пляцоўку, у фінале танцаў каманда-пераможца атрымлівае прызавы васілёк ).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзед-Усевед: Працягваючы тэму " кветкі і свята " трэба сказаць, што ў многіх краінах праводзяцца агульныя святы кветак, а ў некаторых яны прысвечаны найбольш любімым кветкам, у гонар якіх наладжваюцца пышныя ўрачыстасці. Зараз я буду называць кветкі, а вы адкажыце, у якіх краінах існавалі, ці існуюць іх святы. Зразумелі ? Ітак,мы пачынакем:

- Свята Ружы? ( Іран, Францыя, Балгарыя )
- Свята цюльпанаў? ( Галандыя )
- Свята нарцысаў? ( Швейцарыя )
- Свята ландыша? ( Германія, Францыя )
- Свята лотаса? ( Егіпет )
- Свята незабуткі ( Англія )

( адказаўшыя правільна атрымліваюць прызавы васілёк )

У Беларусі на працягу апошніх 10 гадоў сімвалам аднаго з самых прэстыжных святаў, якое праводзіцца ў чэрвені месяцы, стала рознакаляровая кветка творчасці, а адметнай асаблівасцю гэтага свята - выстава і кірмаш кветак розных народаў. Як называецца гэтае свята ?... (Усебеларускі фестываль нацыянальных культур,горад Гродна . Удзельнік, які правільна адказаў на гэтае пытанне, атрымлівае прызавы васілёк і афішу Усебеларускага фестывалю нацыянальных культур ).

На беларускім народным свяце " Купалле " раніцай або ўвечары дзяўчаты заўсёды збіралі кветкі, а вечарам каля храмаў наладжвалі сапраўдныя кірмашы кветак і зёлак. Каля кастроў, або на вадзе ў час гэтага паэтычнага, чароўнага свята дзяўчаты варажылі на кветкавых вянках аб каханні і будучым лёсе і заўсёды шукалі ў лесе сімвал надзеі і шчасця - папараць кветку.

Вось і зараз, падтрымліваючы гэту традыцыю, мы з вамі будзем яе шукаць, а хто яе знойдзе - будзе прызнаны самым шчаслівым чалавекам нашага свята і прынясе сваёй камандзе прызавы васілёк. Гэта кветка можа знаходзіцца ў самым незвычайным месцы - на галінках дрэў, кустоў, у траве, пад вашымі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

крэсламі, на сцэне... А пазнаеце вы яе па лісточках папараці і яскравай кветцы. Кветка знаходзіцца недалёка, не больш чым у дзесяці метрах ад мяне. Ітак, шукаем кветку шчасця!

( Гучыць вясёлая цымбальная мелодыя беларускай полькі. Усе шукаюць папараць-кветку. Пераможца атрымлівае прыз і жэтон-васілёк ).

Дзед - Усевед: Нарэшце падышла чарга аднаго з самых адказных турнірных выпрабаванняў Алімпіяды знаўцаў кветак - конкурс капітанаў !

( Гучаць урачыстыя фанфары )

Мы запрашаем на сцену самых мудрых і знаходлівых інтэлектуалаў - капітанаў сямі каманд - выкладчыкаў батанікі !

( На фоне музыкі капітаны падымаюцца на пляцоўку да мікрафонаў )

Паважаныя капітаны ! Зараз мы з вамі правядзем алімпійскі турнір з выбываннем - чвэрцьфінал, полуфінал і фінал. Пасля першага тура з ліку удзельнікаў турніра выбывае тры капітана, пасля другога тура - два капітана і ў фінале сустракаюцца двое самых лепшых знаўцаў кветак.

У час турніра капітаны павінны адказаць на прапанаваныя пытанні. За кожны правільны адказ удзельнік атрымлівае прызавы васілёк, які ўключаецца ў агульную сумму каманды, а пераможца турніра, акрамя таго, атрымлівае яшчэ тры прызавых васілёчка. Судзіць вашы адказы будзе сімвал нашай Алімпіяды - чароўны вянок, які будзе зіхацець рознакаляровымі агеньчыкамі пасля кожнага вернага адказу. Удзельнікі каманд кожны правільны адказ сустракаюць дружнымі воплескамі.

( у эфіры гучыць музыка - роздум ). У конкурсе капітанаў на абдумванне кожнага пытання даецца 5 секунд.

Мы пачынаем чвэрцьфінал:

- Самая вялікая кветка ?... ( Архідэя, дыяметр пялёсткаў да двух метраў )
- Самая маленькая кветкавая расліна ?... ( раска, памер ад 2 да 10 мм )
- Самая вялікая травяністая кветкавая расліна ?... ( Банан, да 7 м вышынёй )
- Якая кветкавая расліна мае да 100 м у вышыню?... ( эўкаліпт )

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- Якая кветкавая расліна дажывае да 1000 гадоў ?... ( дуб )
- У якой краіне вышэйшая ўзнагарода - ордэн Хрызантэмы ?.. ( Японія )
- Якая горная кветка занесена ў Чырвоную кнігу ?... ( Эдэльвейс )
- Якім газам дыхае расліна ў светлы час сутак ?... ( Вуглекіслы газ )
- У якой краіне васілёк - сімвал свабоды ?... ( Бельгія)
- Пры дапамозе чаго ў расліне ўтвараецца хларафіл і ідзе фотасінтэз ?... ( святло ).
- Калі поле бывае блакітным ?... ( калі цвіце лён )
- Царыца кветак ?... ( ружа)
- Кветка русалак ? ( гарлачык )
- Любімая кветка Жан Жака Руссо ? ( барвінак )
- Кветка мар і курыльшчыкаў опія ? ( мак )
- Эмблема закаханых у сябе ? ( нарцыс )
- Любімая кветка кітайцаў ? ( півоня )
- Любімец турэцкіх гарэмаў і кветка біржавой ігры ? ( цюльпан )
- Кветка - зорка ? ( астра )
- Расліна " след белага чалавека " ( падарожнік )
- Кветка - капюшон ? ( настурцыя )
- Народная назва бегоніі ? ( вуха Напалеона )
- Сонечная кветка? ( сонечнік )
- Кветка памяці ? ( незабудка )
- Дзікая ружа ? ( шыпшына )
- Беларуская прымаўка кажа: " Няма ягады без кветкі ". А якая ягада самая вялікая ? ( кавун )

Дзед-Усевед: Ну вось і завяршыўся чвэрцьфінал. Я прашу членаў журы вызначыць чатырох удзельнікаў паўфінала. ( Журы падводзіць вынікі , прайграўшыя атрымліваюць прызавыя васількі за правільныя адказы і пакідаюць пляцоўку. Гучаць урачыстыя фанфары ).

Мы пачынаем паўфінал. Уважліва слухайце пытанні:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- Кветка, якая расце ў жыце ?... ( Васілёк )

- Дзе захоўвае ваду кактус ?... ( У сцябліне )

- Фіялка - гэта адналетняя ці двухлетняя расліна ?... ( Адналетняя)

- Што такое абоеполая кветка ?... ( У якой ёсць песцік і тычынка )

- Якая травяністая кветкавая расліна пачынае свой рост зімой пад снегам ?.. ( пралеска )

- Ці ёсць кветка ў папараці ?... ( няма )

- Як размножваецца папараць ?... ( спорамі )

- Што такое фотасінтэз ?... ( працэс стварэння арганічных рэчываў з неарганічных з выкарыстаннем энергіі святла )

- Вянкі з лісця якога дрэва плялі для пераможцаў Алімпійскіх гульняў у старажытнай Грэцыі ? ( Лаўр )

- Як называецца першы запаведнік на усходнеславянскай тэрыторыі ? ( Белавежская пушча )

- Любімая кветка Гётэ ?... ( фіялка)

- Сталіца старажытных персаў называлася Суза. Што гэтае слова азначае ў перакладзе ?... ( горад лілей )

Дзед-Усевед: Паўфінальная баталія скончылася і я прашу журы падвесці вынікі. ( Журы аб"яўляе фіналістаў конкурса. Прайграўшыя удзельнікі атрамліваюць прызавыя васількі за правільныя адказы і пакідаюць пляцоўку.

Гучаць урачыстыя фанфары).

Мы пачынаем фінал конкурса капітанаў. Я прашу падтрымаць нашых інтэлектуалаў дружнымі воплескамі ( усе апладыруюць ). Зараз кожнаму з капітанаў па чарзе мы будзем задаваць пытанні дзесяціраундавага паедынку.

Вось якія пытанні мы падрыхтавалі для фіналістаў:

- Якая кветка ў казцы была калыскай эльфаў і з яе з"явілася Дзюймовачка ?..

( цюльпан )

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- Якія кветкі ў казцы шукала Беласнежка ?... ( ландышы )

- Назавіце пісьменнікаў або творы, дзе сустракаецца упамінанне аб

аб цюльпане ?... ( А.Дюма " Чорны цюльпан", А.Дюма " Віконт дэ Бражэлон", А Купрын " Сталетнік " )

- Адкуль родам бэз ?... ( з Малой Азіі )

- З якой кветкай кітайцы сустракаюць Новы Год ?... ( З нарцысам )

- Народная прыкмета кажа: трэба садзіць бульбу калі цвіце.... ?

( чаромха )

- Па легендзе гэтая кветка ў старажытнасці служыла парасончыкам для маленькіх гномікаў, а зараз на гэтай кветцы дзяўчаты варожаць аб каханні.

Як яна называецца ... ? ( рамонак )

- Якую траву з сухімі залацістымі кветкамі называюць лекамі ад 99 хвароб ?

( зверабой )

- У назвах якія кветкак - імёны людзей ? ( Маргарытка,Лілія,Разалія, Анюціны вочкі, Іван ды Мар"я ).

- За выратавання жыцця суайчыннікаў у старажытнем Рыме ўзнагароджвалі

ганаровым вянком. З лісця якога дрэва плялі гэты вянок ? ( З дуба )

- Якія кветкі знаходзяцца ў сучасным гербе Канады ? ( ружа, лопух і нарцыс, якія указваюць на тых, хто залажыў аснову канадскай дзяржавы - Англія, Шатландыя, Уэльс )

- У Інданезіі ёсць расліна, якая расце па краях кратэраў вулканаў. Яна заўсёды напярэдадні выবяржэння вулканаў расквітае і гэта служыць папярэджаннем людзей аб небяспецы. Як называюць гэтую " каралеву землятрусаў " ? ( каралеўская прымула )

- Што сімвалізуе ў Беларусі дзявочы вянок з палявых кветак ? ( цнатлівасць

- У час аднаго са святаў дзяўчаты, варожачы аб лёсе, кідалі вянкі кветак на бярозу. Як называецца гэта свята ? ( Сёмуха)

- Як у Беларусі называюць шлюбны вянок ? ( вэлюм )

- Пры дапамозе якой кветкі жанчыны асветліваюць валасы? ( рамонак)

- Якую кветку ніколі нельга пабачыць? ( папараць- кветку, бо яе не існуе )

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- ..... І тчэ, забыўшыся, рука

Замест пярсідскага узора

Цвяток радзімы васілька.

Хто напісаў гэтыя вершы ? ( Максім Багдановіч )

Вось і закончыўся конкурс капітанаў. Паважаныя удзельнікі, як вы лічаце, хто перамог ў гэтым змаганні ? Адкажыце вашымі воплескамі і скандзірваннем імені пераможцы! ( удзельнікі падтрымліваюць сваіх капітанаў. Гучаць урачыстыя фанфары). А зараз слова журы !

( Журы падводзіць вынікі. Пад гукі музыкі капітанам уручаюцца прызавыя васількі ).

Дзед-Усевед: Кветкі знайшлі адлюстраванне ў творчасці многіх паэтаў і кампазітараў, захаваліся ў творах вусна-паэтычнай творчасці. Нашы удзельнікі, рыхтуючыся да правядзення Алімпіяды, старанна вывучалі легенды, паданні, песні, вершы аб кветках, рыхтавалі пластычныя і харэаграфічныя кампазіцыі аб кветкавых раслінах.

І зараз мы распачынаем творчы конкурс Алімпіяды. Кожная каманда па чарзе будзе дэманстраваць свае нумары, а наша журы вызначыць лепшых выканаўцаў у намінацыях " вусна - паэтычная творчасць", "верш", " песня", " танец". Пераможцы намінацый прынясуць сваім камандам па тры прызавых васілька.

Капітанаў каманд я прашу падыйсці да нашага вянка і выцягнуць з рамонка пялёстак, на якім напісаны парадкавы нумар вашага выступлення.

( Гучыць музыка. Капітаны каманд падыходзяць да рамонка, выцягваюць пялёстак і абвяшчаюць парадкавы нумар канцэрта сваёй каманды .

На сцэне адбываецца творчы конкурс каманд, вядучымі праграм з"яўляюцца

кіраўнікі дэлегацый-удзельніц )

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзед-Усевед: Ну вось і закончылася наша падарожжа па краіне кветак. Пакуль журы будзе падводзіць вынікі, мы для ўсіх удзельнікаў Алімпіяды праводзім кветкавую дыскатэку. Гэта - апошні конкурс, які ацэньваецца ў тры балы і можа значна палепшыць шанцы любой з каманд. А задача каманд - масавасць удзелу і якасць выканання танцаў, у час якіх вы павінны ўразіць усіх прысутных. Кожная каманда танчыць у межах свайго пялёстка, а яе найлепшая пара выходзіць на пляцоўку. Пачынаем дыскапраграму !

( Праходзіць танцавальны конкурс. Адзін з членаў журы ацэньвае ўзровень выступленняў каманд, а астатнія падводзяць вынікі. Танцавальная праграма складзена з твораў, рэкамендаваных у дадатку і новых мелодый аб кветках, якія з" явіліся ў апошні час ).

Гучаць пазыўныя фанфар.

Дзед-Усевед: Для падвядзення вынікаў Алімпіяды знаўцаў кветак я запрашаю на сцэну наша паважанае журы !

( На фоне музыкі члены журы абменьваюцца сваімі ўражаннямі аб Алімпіядзе, старшыня журы падводзіць вынікі. Пад гукі урачыстай музыкі пачынаецца рытуал узнагароджвання пераможцаў:

- Усе удзельнікі атрымліваюць памятныя падарункі ( кнігі аб кветках)

- Пераможцы творчых намінацый атрымліваюць ганаровую узнагароду - ордэн " Васілёк "

- Пераможцу конкурса капітанаў на плечы ускладаюць " залатую " стужку з надпісам " Знаўца кветак ".

- Каманда-пераможца атрымлівае Ганаровую грамату ў выглядзе кветкі і вялізарны торт у форме васілька, а ўсім удзельнікам каманды на галаву дзяўчаты ўскладаюць вянок з зеляніны і кветак.

У гонар пераможцаў гучыць велічная музыка і ўспыхвае белымі бенгальскімі агнямі піратэхнічная кветка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

КОНКУРС ПРЫГАЖОСЦІ " КАРАЛЕВА КВЕТАК "

Конкурс прыгажосці праводзіць дзяўчына ў вобразе багіні кветак Флоры.

У конкурсных выпрабаваннях прымаюць удзел сем дзяўчын ва ўзросце ад 15 да 25 гадоў. Падрыхтоўкай адабраных на касцінгу будучыя канкурсантак займаюцца мадэльера, візажысты, харэографы, музыкі, літаратары, фалькларысты.

У праграме конкурсу:

15.00 Харэаграфічная кампазіцыя " Ой у лузе, лузе зяляненькім ".

15.03 Парад і прадстаўленне удзельніц конкурсу, на галаве якіх - прычоска з вянком або каронай з абраных кветак.

15.05 Першы тур - " Знаёмства" ( расказ кожнай канкурсанткі аб сябе, сваім кветкавым гараскопе, любімых кветках і іх ролі у іх жыцці ).

15.10 Нумар творчага калектыва.

15.13 Другі тур - Віктарына аб кветках.

15.18 Нумар творчага калектыва.

15.21 Трэці тур - Расказ, легенда ці паданне аб кветках на фоне музыкі.

15.33 Нумар творчага калектыва.

15.36 Чацвёрты тур - выкананне верша, песні, музычнага твору, танца або пластычнай кампазіцыі аб кветках.

15.57. Нумар творчага калектыва.

16.00 Пяты тур - дэманстрацыя канкурсанткамі касцюма і галаўнога убору з кветак і раслін.

16.03 Нумар творчага калектыва.

16.03 Шосты тур - складанне канкурсанкамі букета з прапанаваных кветак і тлумачэнне іх сімволікі.

16.08 Нумар творчага калектыва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

16.11 Сёмы тур - выкананне канкурсанткамі " Вальса кветак " ( музыка П.І Чайкоўскага з балета " Шчаўкунчык ").

16.14 Нумар творчага калектыва.

16.17 Падвядзенне вынікаў конкурса.

16.20 Рытуал ушанавання " Каралевы кветак ".

( Абраная каралева на карэце або кані, ўпрыгожаных кветкамі, ў суправаджэнні музыкаў і дванадцаці святочна апранутых дзяўчат здзяйсняе ганаровы марш па тэрыторыі свята. Затым ёй ускладаюць на галаву вянок або карону з руж, дораць падарункі. У гонар " Каралевы кветак " запальваюцца піратэхнічныя фантаны і ў небе з'яўляецца трохкратны россып салюта ).

" КВЕТКІ - ПРЫГАЖОСЦЬ ЗЯМЛІ "

( гульнёвая праграма )

Пляцоўка ўпрыгожана рознакаляровымі кветкамі, букетамі. На задніку выява сонейка,дрэўцы, кусцікі, кветкі. Гэта ўсё павінна нагадваць лясную палянку. Гучыць мелодыя беларускай народнай песні " Медуніца ". Каля брамкі, ўбранай кветкамі, гасцей сустракаюць дзяўчынкі - " кветкі ", якія раздаюць уваходзячым букецікі з сямі аднолькавых кветак ( васількоў, рамонкаў і г.д. ). Усяго - сем назваў кветак. Святло прыгасае і на задніку з'яўляюцца карціны жывапісных мясцін Беларусі ( слайды ). Яны змяняюць адна другую. Потым святло ўспыхвае. У цэнтры пляцоўкі стаіць жанчына ў прыгожым зялёным убранні. Гэта - вядучая. Вакол яе прыселі дзяўчынкі, якія апрануты ў прыгожыя касцюмы розных кветак. Музыка прыціхае.

Вядучая: Прывітанне, паважаныя госці ! Я і мае кветачкі вельмі рады вам. Давайце знаёміцца. Мяне завуць Флора. Маё імя ўвасобіла ў сябе ўвесь зялёны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пакроў нашай планеты Зямля. Дрэвы, кусты, травы, кветкі - гэта я. Без мяне на Зямлі не было б і жыцця. Я спадзяюся, што няма на свеце чалавека, які б не ведаў аб гэтым. Уявіце сабе зямлю без лясоў, палёў, лугоў і садоў... Расліна для чалавека - гэта і ежа, і адзенне, і разнастайныя патрэбны рэчы, гэта і цяпло і паветра, без якіх не можа існаваць чалавек. А яшчэ ўсё гэта - прыгажосць. І таму неабходна берагчы багацце планеты. А вы як лічыце, што самае прыгожае ў свеце раслін? Безумоўна - кветкі. Кветкі спадарожнічаюць нам усё жыццё. Мне вельмі хочацца, каб кветкі, якія сустрэлі вас тут сёння, прыемная музыка, гульні, конкурсы, смех і вяселле далі вам адпачынак.Добрага вам настрою! А зараз я запрашаю вас на вальс кветак.

( У выкананні ансамбля беларускіх музыкаў гучыць вальс. Дзяўчынкі-кветкі ідуць у зал, адны з іх запрашаюць жанчын, другія - мужчын, потым аб'ядноўваюць іх у пары).

Вядучая: Дзякуй усім за танец. А зараз я прапаную умовы нашага першага конкурсу. Усе, хто атрымаў букет з сямі кветак, павінны на працягу вечара абменьвацца кветкамі, каб у выніку атрымаўся букет з сямі розных кветак. Пераможцам будзе той, хто першым гэта зробіць. Усе зразумелі? Тады поспехаў вам!

А астатніх запрашаем прыняць удзел у аўкцыёне, які складаецца з двух частак.Па-першае, вы павінны назваць усе вядомыя вам палявыя і лугавыя кветкі. Калі ласка!

( Удзельнікі называюць лугавыя і палявыя кветкі: купальнік, расіца, лотаць, куколь, белы гарлачык, казялец і г.д. ).

Вядучая: Пераможцу запрашаю да сябе для атрымання прыза, а астатніх - прыняць удзел у другой частцы аўкцыёна: вам трэба назваць лясны кветкі. Ітак, пачынаем!

( Удзельнікі называюць лясныя кветкі: пралеска, гайнік, вяснянка, плакун, дзядоўнік, лянівец, сардэчнік і г.д. ).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вядучая: Пераможца таксама атрымоўвае прыз. А яшчэ ім абоім надаецца права сабраць дзве каманды па 10 чалавек у кожнай.

( гучыць вяселая музыка, пераможцы аўкцыёну набіраюць каманды ).

Вядучая: Зараз мае памочніцы-кветачкі будуць задаваць розныя пытанні, загадваць загадкі. Вы павінны ўважліва слухаць і адказваць. У якой каманды будзе больш адказаў, тая і пераможца. Перад кожнай камандай стаіць вазачка, побач кветкі. За кожны правільны адказ каманда ставіць па адной кветцы ў вазачку. Такім чынам кветкі дапамогуць вызначыць пераможцу. Першая каманда атрымлівае назву луг, а другая - лес. Калі ласка, пачынаем!

Першая дзяўчынка: Жыла дзяўчынка з добрым сэрцам і прамяністымі вачыма. Ўсім яна давярала, ўсяму знаходзіла апраўданне. Жыла яна ў вёсцы. І аднойчы сустрэла дзяўчына хлопца, які абудзіў у ёй першае каханне. Усім сэрцам, усім жыццём пацягнулася яна да яно. А хлопец спужаўся і зазбіраўся ў дарогу па неадкладных правах. Абяцаў вярнуцца... Доўга глядзела дзяўчына на дарогу, чакаючы каханага, і ціха гасла ад смутку. А калі загінула, то на месцы яе пахавання выраслі кветкі. Трохцветныя, ў якіх адлюстравалася надзея, здзіўленне, смутак... Што гэта былі за кветкі ?

( анюціны вочкі. )

Другая дзяўчынка: Імчацца думы на раздолле -
Туды, дзе зелянеюць усходы,
Дзе срэбрам засіяюць воды
Між гор прабіўшайся ракі,
Цямнее рог сівога бору...
І тчэ, забыўшыся, рука
Замест пярсідскага ўзору
Цвяток радзімы.... ( васілька )

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Трэцяя дзяўчынка: Рос Дзям'ян, вырас,

На белы свет вылез,

Праз зямлю прайшоў,

Чырвоную шапку знайшоў,

Шапку зняў,

Дзяцей спаць паклаў.

Што гэта? ( Мак. )

Чацвёртая дзяўчынка: Некалі на зямлі быў толькі адзін сродак руху для пераездаў - гэта ямшчына. І калі спрытныя, забубенныя ямшчыковыя песні ды мелодыі бубянцоў пад дугой разліваліся навокал - і прараслі кветкі менавіта там, дзе разліваліся пералівы гукаў... Што гэта за кветкі? ( званочак )

Пятая дзяўчынка: А па якія кветкі выпраўляла ў лес злосная, наравістая прынцэса маленькую добразычлівую сіротку ў траскучы студзеньскі мароз?

( Пралескі ).

Шостая дзяўчынка: Жоўты Антон круціцца на ножцы,

Дзе сонца стаіць - туды і паглядзіць.

Што гэта ? ( Сланечнік. )

Першая дзяўчынка: У славянскіх народаў раз у год адбывалая свята, калі сапраўдныя кветкі і міфічныя станавіліся падставай для танцаў, песень, вясёлых жартаў, а таксама для загадкавых шуканняў скарбаў у таямнічым цёмным лесе. Менавіта на гэта свята апоўначы расцвітала цудоўная кветка ўсяго на некалькі хвілін. І хто знойдзе яе ў лесе, будзе лічыцца самым шчаслівым чалавекам у свеце. Што гэта за свята і як завецца гэта кветка?

( Купалле, папараць-кветка .)

Другая дзяўчынка: Гэта было ў час татара-мангольскага шашэсця. У мангольскага хана раптам захварэў сын. Нават самыя знакамітыя знахары не

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

маглі дапамагчы хлапцу. І тады хан звярнуўся да паланянак,паабяцаўцы выканаць любое пажаданне той, хто зможа вылечыць сына. Наперад выйшла простая беларуская сялянка.

- Хан, забудзь дарогу на Палессе! За гэта вылечу тваго хлопца.

І яна дастала галінкі лекавай расліны, якая расце ў нашых лясах, цвіце прыгожымі блакітнымі кветачкамі, пакрываючы зямлю пушыстым мяккім дыванам.

Як вы думаеце, што гэта за расліна?

( Чабор. )

( Паля заканчэння віктарыны падводзяцца вынікі, пераможцы атрымліваюць прызы. )

Вядучая: З кветкамі цесна звязаны духоўны свет чалавека. І хаця кожны па-свойму ўспрыймае прыгажосць, аднак ёсць прыгажосць, якая ўспрыймаецца ўсімі аднолькава - прыгажосць кветак.

Дарыць кветкі, значыць выказваць пачуццё кахання, павагі, сяброўства. А каб дарыць кветкі, трэба ведаць ці адпавядаюць яны выпадку.

Першая дзяўчына: Паводле падання - цюльпан раскрыўся на смех дзіцяці, таму дарыць гэтыя кветкі пажадана з нагоды радасных падзей. Дзецям лепей за ўсё дарыць адну якую-небудзь кветку, маленькі букецік фіялак ці мімозы.

Другая дзяўчынка: З нагоды васемнаццацігоддзя, сканчэння школы, наваселля - складаецца букет з кветак некалькіх гарманіруючых колераў. К юбілеям дарацъ букеты з хрызантэм, бэзу, лілеяў, руж ці гваздзікаў.

Трэцяя дзяўчынка: У бальніцу непажадана прыносіць белыя ці чырвоныя кветкі. Лік кветак у букеце павінен быць няцотным.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Чацвёртая дзяўчынка: Па вуліцы кветкі трэба несці загорнутымі, а перад уручэннем разгарнуць, узяць букет у левую руку, а правую падаць для прывітання.

Пятая дзяўчынка: А як абазначаюць колеры кветак ? Чырвоны - агонь, незалежнасць, страсць, каханне, адданасць.

Шостая дзяўчынка: Жоўты - гэта жыццё, радасць, асалода, а вось ярка-жоўты - рэўнасць, здрадніцтва. Аранжавы колер цёплы, сімвалізуе сілу, уладу, гонар.

Першая дзяўчына: Сіні колер халодны, сур'ёзны, выказвае смутак, вернасць, давер'е і бясконцасць.

Другая дзяўчына: Фіялетавы - цяжкі, халодны і ў той жа час урачысты. Азначае веліч, раскошу і сяброўства.

Трэцяя дзяўчынка: Зялёны колер сімвалізуе мір, спакой, урадлівасць.

Чацвёртая дзяўчынка: Белы колер - нейтральны, добра кантрастуе з усімі кветкамі, сімвалізуе чысціню, пяшчоту.

Вядучая: Вось як многа можна сказаць кветкамі. А зараз надыйшоў час падвесці вынікі першага конкурсу. Я запрашаю на пляцоўку ўсіх, у каго атрымаўся букет з сямі розных кветак.

( На пляцоўку выходзяць удзельнікі конкурсу, пераможцы ўзнагароджваюцца прызамі. )

Пераможцам я прапаную пачаць наступную гульню. Умовы: аднаму з вас

Я перадаю вяночак з кветак,а мае памочніцы зараз раздзеляць вас і вашыя каманды кветкавай гірляндай. Вы павінны па чарзе перакідваць вяночак праз

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гірлянду, а члены вашай каманды называць адну к кветак, якія растуць на беларускай зямлі, а таксама вырошчваюцца ў аранжэрэях і хатніх умовам.

Зразумелі? Тады пачынаем!

( Гучыць вясёлая музыка фальклорна-інструментальнага ансамблю, на пляцоўцы адбываецца гульня. Каманда - пераможца ўзнагароджваецца цукеркамі " Рамонак ". )

На беларускіх веснавых і летніх святах дзяўчаты заўсёды плялі вянкі. Таму мы прапануем кожнай камандзе выдзяліць некалькі удзельнікаў, якія за вызначаны час сплятуць найбольшую колькасць вянкоў для удзельнікаў сваёй каманды. Выбралі? Цудоўна! Я прашу абраных людзей падыйсці да столікаў, дзе ляжаць кветкі і пачаць пляценне вяноў з васількоў і рамонкаў. А пакуль будзе праходзіць гэта змаганне, я аб'яўляю канцэрт-экспромт. У канцэрце павінны прагучаць песні, вершы, апавяданні аб кветках. Хто жадае, калі ласка!

( Ідзе канцэрт - экспромт, пачатак якога - выступленне фальклорнага калектыву. За гэты час удзельнікі каманд рыхтуюцца да ўдзелу ў канцэрце .)

Вядучая: Удзельнікі канцэрта атрымліваюць узнагароду !

( Адбываецца ўзнагароджванне ўдзельнікаў канцэрта. )

А зараз будзем спяваць усе. Кожная каманда па чарзе спявае песню пра кветкі. Якая каманда праспявае найбольш песень, тая і будзе пераможцай. Калі ласка!

( Ідзе конкурс, пасля заканчэння пераможцы ўзнагароджваюцца прызамі. )

Я бачу, што на конкурснай пляцоўцы ўсё гатова. Усіх удзельнікаў я запрашаю да сябе са сваімі вырабамі - вяночкамі. За вашу творчую працу мы вас узнагароджваем падарункамі.

( Гучыць музыка, удзельнікі конкурса атрымліваюць прызы. )

Кветкавыя вянкі на святах дзяўчаты заўсёды плялі не толькі дзя сябе, але і для сваіх сяброў. Таму я прашу удзельніц конкурса ўсе выраблены імі вянкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўскласці на галовы прадстаўнікоў сваёй каманды, як сімвал добразычлівасці, павагі і сяброўства.

( Гучыць музыка, дзяўчаты дараць вянкі прадстаўнікам сваёй каманды. )

На беларускіх народных святах, там дзе кветкі - там заўсёды карагоды. І таму зараз мы запрашаем усіх удзельнікаў у наш развітальны карагод прыгажосці. У час карагоду нашы дзяўчынкі - кветачкі будуць абменьвацца з вамі вянкамі і вы ўсе, па старадаўняму звычаю, павінны ў гэты момант сказаць адзін аднаму найлепшыя пажаданні . Пачынаем карагод прыгажосці!

( Гучыць карагодная песня " Медуніца " ў выкананні фальклорнага калектыву. На пляцоўцы ўсе заводзяць карагод. )

Вядучая: Ну вось і прыйшла пара развітвацца. Я спадзяюся, што наша сустрэча прынесла вам адпачынак, падняла ваш настрой. І мне вельмі хочацца пажадаць вам шчасця, міру, здароў'я, дабрабыту, няхай побач з вамі ўсё жыццё цвітуць кветкі !

Усяго вам найлепшага !

Да пабачэння !

К.М.Пятровіч

" БАЛЬ КВЕТАК "

( ГУЛЬНЁВА-ЗАБАЎЛЯЛЬНА ПРАГРАМА ДЛЯ МОЛАДЗІ ).

Памяшканне, дзе будзе праходзіць баль, упрыгожаны кампазіцыямі з кветак, зелянінай. З правага боку эстраднай пляцоўкі на подыўме стаіць прыгожы, вялізны букет кветак, якія відаць з любога месца ў зале. У левым куце мноства розных кветак, якія потым будуць выкарыстаны у гульнях, конкурсах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гучыць " Вальс кветак" з балета П. Чайкоўскага " Шчаўкунчык ". На экране дэманструюцца слайды з рознымі кветкамі. У гэты час экран асвятляецца рознакаляровым святлом. Гучыць голас дыктара.

1 дыктар: Вядома мне: яно не нова,
Ды я сцвярджаю між другіх,
Што кветак ведаю размовы -
І лугавых, і палявых.

Нядоўгі век - адна гаворка,
Але дзяўчатам на вянкі
З ахвотаю на іх галоўкі
Ідуць рамонкі, васількі.

Бэз блакітны, бэз духмяны,
Нас чаруе водар твой.
І сябруеш ты заўсёды
З сонцам, маем і вясной.

Бэз цвіце - сонца промні купае
У духмяным настоі ўсе дні
І суквецці нібы закіпаюць
Ад яго цеплыні, дабрыні.

Бэз цвіце - быццам музыка л'ецца
Нада мной,
Над планетай усёй.
Бэз цвіце - і да сэрца хінецца
Свет,
Астужаны майскай красой.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Нечаканаю квіценню белай
Зацвіла ружа-кветка ўвесну,
І яе нечуваная смеласць
Дакранулася сэрца балесна.
Дзкуй, дзякуй табе ружа-кветка,
Маёй немачы лекар і сведка.

Схіляецца ніва да самай зямлі,
У кветках паснулі ад спёкі чмялі,
На лапах замшэлых калышацца бор,
І пахам дурманіць духмяны чабор.

А вось гэтую кветку лотаць
Я каханай падару,
Той, каторую люблю,
Хай галіначку шануе.

Прыгожыя астры ў саду расцвілі,
Убраліся ў росы, вянкі расплялі.
А рамонкі маладыя ціха шэпчуць, быццам у сне,
Каб я зноў паваражыла: любіць ён мяне ці не ?

Чырвоныя кветкі растуць на палетках,
Вы - нашай любові натхнёныя сведкі,
Вас болей і болей сягодня пад сонцам,
Расціце, красуйцеся вечна, бясконца !

2 дыктар: Квітнеючы сад, квітнеючае поле, квітнеючы луг... Здаецца, што

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гэта багацце - вечнае. Але год ад году бяднее прыгажосць, і мы ўсё радзей сустракаем кволыя сцяблінкі белай ветраніцы, залацістыя кветачкі зверабою, душыстага ландыша, жоўтага гарлачыка і белай лілеі.... Кветкі знікаюць ад бяздушнай руі чалавека... Захаванне рэдкіх відаў раслін і тых, хто знаходзіцца пад пагрозай знікнення, задача кожнага чалавека.

( На гэтым фоне ўспыхнула вясёлка і высвяціла застыўшых на сцэне ў розных позах дзяўчат - " кветак ". Пад музыку на сцэне з'яўляецца Фея, яна трымае ў руках букет кветак і рознакаляровую палачку. Фея дакранаецца чароўнай палачкай да дзяўчат - " кветак "

і яны пачынаюць кружыцца ў вальсе, запрашаючы на танец гледачоў. Затым загаранцца яркае святло.

Фея: Ханс Крысціян Андэрсэн некалі сказаў: " Кожнаму чалавеку,

Каб жыць на зямлі, патрэбны сонца, свабода і маленькая

кветачка ". І

гэта так. Таму што нічога прыгажэйшага і чысцейшага на зямлі няма. Кветкі разбудзяць мару, навеюць задуменнасць, створаць адчуванне лёгкасці, светласці, чысціні. Яны суправаджаюць нас усё жыццё: сустракаюць пры нараджэнні, цешаць у старасці, радуюць на вяселлі і розных святах. І гэты святочны чароўны букет я аддам таму, хто болей назаве кветак, з якіх ён складзены.

( Прысутныя называюць кветкі, якія ёсць у святочным букеце. Дзяўчынкі - " кветачкі " ўзнагароджваюць знаўцаў флоры жэтонам у выглядзе кветачкі. Пераможцу вызначаюць па колькасці жэтонаў. Ён і атрымлівае ад добрай Феі цудоўны букет.

Гучыць мелодыя " Сон - трава " з " Пораў году " П. І. Чайкоўскага ).

Фея: А цяпер давайце паспрабуем успомніць, што пісаў у адной са

сваіх казак Андэрсэн?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

... Завыў зімні вецер, а ў доміку было ціха і ўтульна. У гэтым доміку ўкрывалася кветачка. Яна ўкрывалася пад зямлёй і сядзнла нерухома. Потым кветачка ўстала, пацягнулася і вырвалася ўверх, несучы на сваім сцябле бледна-зялёны бутон...

Як гэта кветачка называлася? ( Адказ: Сон-трава.)

Сон-трава - адна з першых вясенніх кветак. Яна прадказвае прыход вясны.

( гучыць музыка )

Вясна разаб'е ледзяныя аковы,
Халодныя здыме з прыроды пакровы,
Разбудзіць і кветкі ад доўгага сну,
І мы з нецярпеннем чакаем вясну!

Сёння да нас завітала багіня вясны - Ляля.

( Музыка гучыць мацней. З'яўляецца багіня вясны Ляля. У руках яна трымае букет першых вясенніх кветак ).

Ляля: Вас сустрэць я вельмі рада,
Рада вас усіх вітаць!
Запрашаю на " паляну ",
Будзем кветкі ўслаўляць!

А ці ведаеце вы, як з'явіліся вясеннія кветкі анемоны? Існуе легенда,што самыя спагадлівыя сняжынкі пераўтварыліся ў кветку, і ад гэтых беласнежных кветак, кветак надзеі, пайшлі анемоны. Яны - сімвал смелага, юнага, квітнеючага.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мы не ведаем месяца
Больш за сакавік шчаслівага,
Калі пушчы цешацца з гоману шумлівага,
Калі кветкі першыя на палях з'яўляюцца,
Нас вітаюць ласкава, шчыра ўсміхаюцца.

А ці ведаеце вы яшчэ кветкі, якія пачынаюць расці яшчэ пад вясеннім снегам? ( Адказ: пралескі, хахлаткі, ветраніцы,чысцякі... Той, хто называе апошнім кветку, атрымлівае прыз - букет першых вясенніх кветак ад багіні вясны ).

Ляля ( на фоне музыкі):
Прачнуўся лес, вясной абуджаны,
І дрэвы велічна стаяць,
Вясёлых ландышаў жамчужыны
Пад кожным кусцікам гараць.

Гэтую кветку ведаюць усе. Ландыш - гэта сімвал вясны. А старажытная славянская легенда расказвае: " Удалога Садко пакахала вадзяная царэўна Волхава. Аднойчы ў месячным зіхаценні яна ўбачыла дзае постаці, у адной з іх пазнала свайго каханага, які абдымаў дзяўчынку Любаву. І з блакітных вачэй царэўны пакаціліся слёзы, якія пераўтварыліся ў пяшчотныя кветкі. З той пары ландыш стаў сімвалам чыстана кахання."

Наўрад ці можна сустрэць чалавека абыякавага да ландыша. Ён быў любімай кветкай Аляксандра Купрына, Соф'і Кавалеўскай, пра яго пісаў Лермантаў, а Чайкоўскі называў яго, нават, каралём кветак. Я не сумняваюся, што вы таксама любіце гэту кветку.

( У гэты час, калі Ляля расказвае, Фея і дзяўчынкі - " кветачкі " раздаюць прысутным па аднаму ландышу. )

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А цяпер тыя, хто атрымаў кветачку, падыйдзіце бліжэй да мяне. Давайце выберем сярод вас двух самых дужых і высокіх юнакоў.

( Дзўчынкі - " кветачкі " выбіраюць двух высокіх юнакоў і падводзяць іх да багіні Лялі.)

Вітаем самых высокіх юнакоў апладысментамі! ( Звяртаецца да юнакоў ) Але вы павінны даказаць, што вы яшчэ самыя спрытныя і лоўкія. Зараз будзе гучаць цудоўная мелодыя, і я ўсіх запрашаю на танец-гульню. Тыя, хто атрымаў кветачку, запрашаюць на танец сяброўку, ці сябра без кветачкі.

А вы, хлопцы-малойцы, пасля заканчэння танца збіраеце ландышы. Хто збярэ найбольшую колькасць іх, той і будзе лічыцца самым спрытным. Толькі рабіць гэта трэба вельмі далікатна, каб кожны мог з задавальненнем аддаць сваю кветачку толькі вам.

( Праводзіцца танец-гульня. Хлопец, які сабраў найбольшую колькасць кветак, аб'яўляецца самым спрытным і ўзнагароджваецца прызам. )

Фея: Я хачу даць вам адну параду. Калі будзеце рваць ландышы для

Сваёй каханай, то рабіце гэта вельмі асцярожна, каб не разарваць карнявішча. Бывае дастаткова пашкодзіць іх невялікую чатку, і згінуць на лясной паляне ўсе ландышавыя парасткі.

( Гучыць мелодыя П. Чайкоўскага " Поры года " )

О, першы ландыш з-пад снегу
Без промняў сонечных не можа жыць,
Ён марыць зняць халодныя аковы
І ледзяныя сэрцы растапіць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ляля: А квітнеючыя на лясных палянках прымулы першыя напаміны

аб набліжэнні лета. Вось што расказвае аб кветках легенда: " Усю доўгую зіму і вясну нябесная Лада знаходзіцца ў палоне густых хмар і туманоў. А ў канцы вясны, калі зіхоткая кветка Пяруна - маланка - прабівае сцены цямніцы, багіня кахання, сонца і згоды з'яўляецца на свет са шчодрымі дарамі - дажджамі і цёплым надвор'ем. Там, куды ўпала першая маланка, вырастаюць прымулы, каб сваімі ключамі-кветкамі адкрыць зямлю для нстрымнага росту зеляніны ".

Фея: Прыходзіць лета звонкае
Птушынаю гамонкаю.
На возеры, ля берага
Яно ўзыходзіць зорамі
І пахне медуніцамі
І спелымі суніцамі

Ці бывалі вы раніцай на няскошаным лузе? Ці чулі, як пазваньваюць званочкі? Не? Тады не прапусціце момант паслухаць дзівосны гімн лету.

( Музыка ўзмацняецца. З'яўляецца багіня лета Цаца. У руках яна трымае кветкі - званочкі )

Ой вы, кветачкі-званочкі,
Найблакітнейшыя вочкі,
Аб чым звініце вы
У гэты дзень чароўны
Дзень вясенні мая,
Між няскошанай травы
Галавой ківаючы.

Цаца: Мае дарагія, паважаныя сябры! Я - багіня лета - Цаца, напамінаю

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

напамінаю, што прыйшло лнта - самая цудоўная пара года, аб чым на ўвесь свет звіняць званочкі. І вы зможаце патрымаць гэты званочак і пазваніць. Для гэтага я запрашаю ўсіх на танец.

( У час танца " Цаца " падыходзіць да любой пары, аддае "званочак" дзяўчыне і займан яе месца. Дзяўчынка са " званочкам "

ідзе да іншай пары і займае месца дзяўчыны, перадаючы ёй "званочак". Так працягваецца да тых пор, пакуль іграе музыка. Дзяўчыну, якая застаецца са " званочкам ", запрашаюць на пляцоўку.)

Можна лічыць, што вам вельмі пашчасціла. Я падару вам вось гэты букет званочкаў. Але, перш чым атрымаць яго, вы павінны адгадаць загадку. Слухайце:

Маленькае, чорненькае<br>
Скрозь землю прайшло,<br>
Чырвоную шапачку знайшло.

( Адказ: Мак. Калі дзяўчына не адгадае, то ёй дапамагаюць прысутныя. Багіня " Цаца " ўручае ёй букет. )

Мак сімвалізуе маладосць і прыгажосць. Па старажытнагрэчаскай легендзе мак узнік з пралітых на зямлю слёз Афрадзіты, калі багіня даведалася аб смерці свайго каханага. Мак шануюць усе народы. Немцы ў час вяселля мак сыплюць у чаравікі маладым, якія ўступаюць у шлюб. У палякаў ёсць звычай гатаваць пад Новы год клёцкі з макам. А якія вы ведаеце стравы з макам?

( Прысутныя называюць. Той, хто назаве страву апошнім, атрымлівае ад багіні " Цацы " ўзнагароду - пірог з макам. )

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Фея: " Макі, макі, маковачкі, залатыя галовачкі ", так называецца гульня , ў якую мы будзем гуляць.

Станьце ўсе ў карагод. А ў цэнтры - самы прыгожы юнак -

" Ярмак".

( Дзяўчынкі - " кветачкі " выбіраюць хлопца і ставяць яго ў цэнтры

круга. )

А цяпер ўсе разам гаворым наступныя словы: " Станем мы так, спытаем пра мак: Ярмак, Ярмак, ці паспеў мак? "

Ярмак адказвае: " Толькі што пасены ". А карагод зноў пачынае спяваць: " Макі, макі, маковачкі, залатыя галовачкі. Станем мы так, спытаем пра мак: Ярмак, Ярмак, ці паспеў мак? ". Ярмак адказвае:

" Квітнее ", " Спее " і, нарэшце, адказвае: " Паспеў ". Тады ўсе бягуць да Ярмака і калоцяць яго, уяўляючы, што калоцяць і трасуць мак, а Ярмак ад іх уцякае.

( Праводзіцца гульня " Мак ". )

Цаца: Як вы думаеце, на чым настойваецца лета? Не ведаеце? Тады

задайце яшчэ адну загадку: " Стаяць на лузе сястрычкі, залатыя

вочкі ў белай спаднічцы ". ( Адказ - рамонак ).

Правільна! Вось лета і настойваецца на белых рамонках.

Белы рамонак - сонца маленькае і трапяткое,

Кволыя промні ўсё асвяцілі жывое.

Летнія лугі і палі немагчыма ўявіць сабе без родных, знаёмых з дзяцінства рамонкаў. Хто ведае, як іх яшчэ называюць?

( Адказ: Бялюшка, Лясная Мар'янка, Белагалоўнік, Беліца-трава,

Сонечнік, Тванаў цвет, Нявестачкіна варожка... Тым, хто называе,

Дзяўчынкі - " кветачкі " даюць па рамонку. )

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Цяпер мы з вамі будзем складаць рамонак. Прашу падыйсці да мяне тых, хто атрымаў рамонак. Разлічыцеся, калі ласка, на " першы" і

" другі ". З цотным нумарам, калі ласка, станьце з гэтага боку, а з няцотным - насупраць. Малайцы. Каманду, якая знаходзіцца справа ад мяне, называем " Іванаў цвет", а злева - " Нявестачка ".

( Дзяўчынкі - " кветачкі " і Цаца раздаюць кожнаму ўдзельніку па пялёстачку. Кожны ўдзельнік па чарзе з адкрытымі вачыма павінен прыклеіць свой пялёстак да падрыхтаванай сцяблінкі. Дзве каманды - два рамонкі. У якой каманды атрымаецца прыгажэйшы рамонак, тая і будзе пераможцай. За перамогу - прыз.)

( Праводзіцца гульня ).

Фея: А вось якая легенда нарадзілася аб прыгожай Мяліндзе і балотным

"цары ". Аднойчы Мялінда заўважыла кветкі, што плавалі на вадзе. Каб дацягнуцца да іх, ступіла на прыбярэжны пень. А гэта быў уладар балота. Ён забраў Мялінду да сябе. І праз год на тым месцы, дзе вада паглынула дзяўчынку, Ўсплылі беласнежныя кветкі ".

Вадзяныя лілеі не толькі ўпрыгожваюць азёры, яны ачышчаюць ваду. Нашы продкі лічылі, што белая лілея і жоўты гарлачык могуць адужаць розныя хваробы і, нават, нячыстую сілу. А калі адпраўляліся ў падарожжа, зашывалі ў пояс кавалкі расліны і насілі ў якасці талісмана. Да гэтага ж высушаныя карані падвешвалі да

ложка хворага. З кветкамі абыходзілі пашу, каб не прападала скаціна.

Лічылася, хто ўбачыць белую лілею з пяццю пялёсткамі, то яго сэрца на ўсё жыццё запоўніцца радасцю. Вось на гэтым імправізаваным " балоце " ёсць ёсць сярод звычайных лілей адна з пяццю пялёсткамі. Хто яе першы знойдзе, той і будзе ўсё жыццё шчаслівы.

( Праводзіцца гульня " Знайдзі сваё шчасце " ).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Цаца: Чайныя ружы стаяць на стале,

Свецяцца квола ў вячэрняй імгле.

Свецяцца блскам сваім залатым,

Дыхаюць водарам тонкім і чыстым.

Няма, магчыма, на свеце такога чалавека, які б ні разу не бачыў ружу. Але і няма такога, які б мог сказаць, што бачыў усе ружы.

Вось вы адкажыце, якія вы ведаеце формы руж?

( Адказ: плоская, шаравідная, чашападобная, кустападобная, квадратная...)

Незалежна ад формы, на працягу стагоддзяў ружа лічылася носьбітам чароўных і боскіх сіл. Кветкі выкарыстоўвалі ва ўсемагчымых абрадах, рытуалах. А што да лекавых якасцей, то яны выкарыстоўваліся чалавекам са старажытных часоў. Ружовае масла дапамагае пры розных хваробах. Нават сабраная з руж раса была лепшым сродкам пры запаленні вачэй. А, можа, вы ведаеце, якімі лекавымі якасцямі валодаюць іншыя кветкі?

( Адказ: адварам жоўтага гарлачыка лячылі зубны боль, а спевакі ўмацоўвалі гэтым адварам галасы; сваімі лекавымі якасцямі славіцца рамонак аптэчны, як добрае снатворнае; ландыш уваходзіў у склад спецыяльных тытунёў і любоўных напіткаў.)

Вучонымі знойдзены новы метад лячэння кветкавым водарам, які эфектыўна ўздзейнічае на чалавека. І, наогул, кветкі служаць сімвалам здароў'я. Усе з гэтым пагаджаюцца, але не заўсёды пра гэта помняць. Некалькі тысячагоддзяў назад людзі прыдумалі мову кахання - мову кветак. Замест слоўнага прызнання ў каханні яны абменьваліся кветкамі. Мова кветак і цяпер жыве ў мастацтве складання букетаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Паважаныя мужчыны і хлопцы, хто жадае падарыць сваёй жанчыне ці дзяў чыне букет кветак? Вам прадстаўляецца такая магчымасць. Калі ласка, падыходзьце да стала. Вельмі ж прыемна кожнай дзяўчыне атрымаць букет кветак ад каханага чалавека.

( Жадаючыя мужчыны падыходзяць да стала, на якім размешчана мноства кветак, і складваюць букеты. У гэты час гучыць музыка.)

Фея: Букеты гатовыя! І зараз мы ўсе пачуем, аб чым гавораць

Складзеныя кампазіцыі. Для гэтага трэба падыйсці да сваёй

дзяўчыны і падарыць ёй свой букет. А зрабіць гэта патрэбна незвычайна, на колькі хопіць у вас фантазіі. Мужчына, які зробіць гэта лепш за ўсіх, атрымае прыз пяшчоты.

( Мужчыны па чарзе дораць свае кампазіцыі каханым. Мужчына-пераможца атрымлівае прыз пяшчоты - пацалунак ад каханай. Затым усе запрашаюцца на танец кахання.)

Цаца: Кветкі - гэта радасць, гэта кахане, гэта вечная крыніца натхнення

Давайце ўявім сабе, што мы знаходзімся ў квітнеючым садзе, дзе расце многа кветак.

( " Цаца", " Ляля" і дзяўчынкі - "кветачкі" разбіваюць прысутных на некалькі колаў. Чым больш - тым лепш. Кожнаму колу даецца назва кветкі. Кола - гэта букет.)

Фея: Вось " букет з рамонкаў, " букет з руж, " букет з ландышаў"...

Сапраўдны баль кветак ! А які баль без карагода?

( Гучыць вясёлая музыка. Усе " кветачкі " спачатку прытрымліваюцца сваіх "букетаў" - колаў. Затым дзяўчаты - " кветачкі ", " Ляля" і " Цаца " імкнуцца ў час танца перамяшаць " букеты " і заводзяць вялікі карагод кветвк. Такім чынам " кветкі " перамешваюцца. Але, як толькі музыка скончыцца, кожная

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

" кветачка " павінна стаць у свой " букет ". Танец - гульня можа паўтарацца некалькі разоў. Пасля заканчэння гульні ўсе становяцца ў вялізны карагод .)

Нічога пргажэйшага і чысцейшага за кветкі няма і не можа быць. Кожная кветачка здольна разбудзіць мару, стварыць адчуванне душэўнай лёгкасці, светлыні, чысціні

( У гэты час " Ляля ", " Цаца " і дзяўчынкі - "кветачкі " раздаюць усім прысутным палявыя кветкі. )

Сёння, калі для многіх кветак існуе пагроза знікнення з планеты, трэба берагчы іх, адносіцца да іх з павагай і любоў'ю.

А кветкі для таго, каб нас аберагаць,
Прыносіць у нашы душы любоў, заспакаенне -
Вось кветак прызначэнне !

Цаца: Прыгожыя кветкі растуць на палетках,
Вы нашай любові натхнёныя сведкі,
Вас болей і болей квітнее пад сонцам -
Расціце, красуйцеся вечна, бясконца !

Ляля: Незаўважна праляцеў час. Ласкай, дабрынёй і сардэчнасцю вы

Сустракалі нас. І на развітанне ад усяго сэрца жадаем вам шчаслівай долі, каб сонца, каб кветкі, каб шчасця даволі !

Фея: Каб травы зелянелі,
Каб птушкі моцна пелі,
Каб кветкі зіхацелі
І радавалі Вас !

( Гучыць вясёлая развітальная музыка. )

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Г У Л Ь Н Ё В А Е П О Л Е.

На гульнёвым полі культарганізатары - майстры добрага настрою ўвасабляюць ніжэйпералічаныя гульнёвыя дзеі.

__РУЛЕТКА - ЛАТАРЭЯ " СІМВОЛІКА КВЕТАК ".

Канструкцыя рулеткі уяўляе сабой спаруду ,падобную канструкцыі рулеткі "Поле цудаў", але з пэўнымі зменамі: па краях круга размешчаны выявы указаных ніжэй кветак,а на дыяганальных лініях,якія вядуць ад кожнай кветкі да цэнтра круга, напісаны значэнні кожнай кветкі. У цэнтры круга на стрыжні замацавана стрэлка-указальнік, якая пры раскручванні круга і яго спыненні указвае на пэўную кветку.

За рулеткай знаходзіцца рэкламны шчыт з аб'явай наступнага зместу : "Рулетка-латарэя "Сімволіка кветак". З даўніх часоў людзі надзялялі кветкі пэўным значэннем. Раскруціце круг - і вы даведаецеся, што азначае і што прынясе ў вашае жыццё кветка , якую сёння падарыў вам лёс ! ".

Па крузе рулеткі знаходзяцца выявы кветак, а на лініях, вядучых да цэнтра круга, напісана, якое значэнне мае кожная з ніжэйпералічаных кветак:

- Акацыя жоўтая і белая - платанічнае каханне
- Акацыя ружовая - элегантнасць
- Анемон - бездапаможнасць, ці хвароба
- Базілік - нянавісць, агіда
- Барвінак - салодкія ўспаміны
- Бэз - першыя хваляванні кахання
- Белая ружа - маўклівасць, любоўныя хваляванні
- Браткі - вернасць
- Бутон белай ружы - сэрца, якое яшчэ не ведае кахання

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- Васілек - далікатнасць, вытанчанасць

- Вераск - адзіноства

- Гарлачык - страчаная вера, надзея

- Гваздзік чырвоны - пылкае каханне, страсці, вернасць, бацькоўская любоў і клопаты

- Гваздзік белы - журба

- Гваздзік жоўты - прызырства

- Гваздзік пёстры,стракаты - прахалода ў каханні

- Гартэнзія - халоднасць

- Гіяцынт - забава, жарт, гора і смутак

- Жоўтая ружа - здрада

- Камелія - абыякавасць

- Канюшына - чаканне

- Кураслеп - спатканне

- Лаванда - недавер

- Ландыш - непарочнасць, святасць, каханне, шчасце, якое вярнулася. .

- Ляўконія(мацыёла) - паспешлівасць, запальчывасць

- Лілея белая - вытанчаны густ, прыгажосць, юнацтва, цнатлівасць, чысціня задум і спраў

- Мак - суцяшэнне, маладосць, прыгажосць

- Маргарытка - цнота, каханне

- Мімоза - сарамлівасць

- Мірта - мір, улада

- Мята - жар пачуццяў

- Нагаткі - смутак

- Нарцыс - эгаізм, каханне ў сябе

- Незабудка - вернасць, памяць

- Півоня - сорам, палымянае каханне

- Пралеска - суцяшэнне, надзея, веснавы настрой

- Прымула - царства нябеснае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- Размарын - ваша прысутнасць ажыўляе мяне
- Рамонак - мір і каханне
- Рэзеда - чалавечая дабрыня
- Фіялка - сціпласць, цнота, дзявоцтва
- Хрызантэма - смерць
- Цюльпан - прызнанне ў каханні
- Чорная ружа - журба
- Чырвоная ружа - каханне, любоўныя пакуты
- Чырвоная і белая ружы разам - агонь сэрца
- Шыпшына - паэтычнасць
- Язмін - ласкавасць

АЎКЦЫЁН " КВЕТКІ ПЛАНЕТЫ ЗЯМЛЯ ".

Вядучы: " Мы пачынаем аукцыен "Кветкі планеты Зямля". Хто апошнім назаве адну з кветак па паказанай мной літары, той атрымае ў падарунак кветку надзеі і сувенір, а параможцам аукцыена і уладальнікам галоўнага прыза стане удзельнік, які атрымае найбольшую колькасць кветак надзей.

Ітак, мы пачынаем! Літара " А ". ( вядучы паказвае літару "А", а затым па чарзе падымае планшэты з выявамі іншых літар алфавіта. Удзельнікі аукцыену называюць кветкі згодна паказанай ім літары. Назвы кветак мы прапануем у ніжэйпералічаным спісе).

" А " - адоніс, астра, архідэя, амарыліс, агератум, аканіт, аксаміткі, акацыя, анемон, агняцвет, амадант, аммобіум.

" Б " - белы гарлачык, барвінак, бэз, браткі , базілік, бягонія, бразгодка, бузіна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

" В " - ветраніца, васілек, валошка, ворлікі, вербена, вяргіня, віола.

" Г " - Гартэнзія, гваздзікі, гіяцынт, гладыёлус, герань, гарлачык, глог, губасцік.

" Д " - дзьмухавец, дзягельнік, дзельфіній.

" Е " -------------------------------------------------------------------------------------------

" Ж " - жаўтавочка, жаўтацвет, жоўты гарлачык.

15.

" З " - змеегалоўнік, зверабой, званочак.

" І " -------------------------------------------------------------------------------------------

" К " - касач, канка, каллы, камелія, крывацвет, канюшына, кактус, крываўнік, купальнік, крокус, каліна, казалес, кураслеп.

" Л " - лілея, лотас, лаванда, ландыш, люцік, лабелія, ляўзея.

" М " - маргарытка, мімоза, мацыела, мак, мар'яннік, мята, мядуніца, мірта, мальва, маліна.

" Н " - нагаткі, нарцыс, настурцыя, незабудка.

" О " -------------------------------------------------------------------------------------------

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

" П " - першацвет, пралеска, падбел, пярэсна, пралеска, прымула, пальмаружа, петунія, півоня, памеранец.

" Р " - рамонак, ружа, рэзеда, розмарын.

" С " - сон-трава, сумнік, скрыпень, светаяннік, светнік.

" Т " - тамарыск, тубероза.

" У " - уюн.

" Ф " - флёрдаранж, фікус, фіялка, флёкса, фатыня.

" Х " - хахлатка, хрызантэма.

" Ц " - цыкламен, цынія, цытрон, цюльпан.

" Ч " - чамярыца, чаромха, чысцел.

" Ш " - шыпшына, шалфей, шафран.

" Э " - эдэльвейс, эхінакактус.

"

Ю"-------------------------------------------------------------------------------------------

" Я" - язмін.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

" СЕЗАМ " АБО МОВА КВЕТАК.

( кніга кахання )

На вялікім прылаўку стаяць у вазах букеты розных кветак. Заднікам прылаўка з"яўляецца макет вялізнай раскрытай кнігі. На раскрытых старонках кнігі напісана " З далёкіх часоў людзі лічаць, што кветкі валодаюць чароўным дарам адлюстроўваць чалавечыя пачуцці і ўзаемаадносіны.

Перад вамі - " Сезам " - прывітанне! Гэта персідская кніга кахання, якая прынесла з Усходу мову кветак, дзе служыла для перадачы тайных любоўных пасланняў. Купіце адну з кветак на прылаўку і скажыце гандляру, аб чым будзе гаварыць гэтая кветка. Калі вы адгадаеце - то атрымаеце ў падарунак яшчэ па адной кветачцы з усіх ваз кнігі кахання ! "

( Пакупнік набывае кветку і гаворыць гандляру кароткую рэпліку гэтай кветкі ў магчымай размове на выдуманай " мове кветак". Гандляр на фоне ўзнікшай персідскай музыкі адкрывае кнігу на старонцы куплёнай кветкі і зачытвае напісаную там рэпліку-пасланне гэтай кветкі. Калі рэплікі пакупніка і кнігі супадаюць - пакупнік атрымлівае прыз - па кветцы з усіх ваз прылаўка. Але разыграная кветка ўжо выбывае з гульні ).

Паводле рускага паэта Змітры Пятровіча Азнабішына, які ў 1830 годзе пераклаў з персідскай мовы і выдаў у Санкт-Пецярбургу кнігу " Сезам або мова кветак ", вось аб чым гавораць расліны :

- АСТРА - ці ўмееш ты любіць пастаянна ?
- ГЛОГ - я ў захапленні, калі ты спяваеш
- ВАСІЛЁК - будзь просты як ён
- ГВАЗДЗІК ПАЛЯВЫ - будзь чароўны, як ён
- ГЕРАНЬ - мне трэба тайком пагаварыць з табой
- ГІАЦЫНТ - лік бутонаў укажа табе на дзень сустрэчы
- БУЛЬБЯНАЯ КВЕТКА - ты пераўзыходзіш ўсё !
- ЛАНДЫШ - доўга і тайна я кахаў цябе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- ЛІМОННЫ ЛІСТ - бывай !

- МАК КВІТНЕЮЧЫ - ты наводзіш сон

- МАРГАРЫТКІ - я жадаю табе ўсяго найлепшага

- ПІВОНЯ - які ты нездагадлівы

- РЭЗЕДА - не твая прыгажосць, а дабрыня ўзяла ў палон маё серца

- ГАЛІНКА РУЖЫ - так !

- ЛІСТОК РУЖЫ - не !

- ЧАРОМХА - як ты мяне абламаў

- ШЫПШЫНА - ці можна табе верыць ?

- ЯЗМІН - будзь задаволены і маёй дружбай

( Калі арганізатары захочуць павялічыць пералік указаных кветак у гандлёвай гульне, яны павінны звярнуцца да наступнай кнігі: Д.П Озно-бишин " Сезам, или язык цветов " - СПб., 1830 )

Г У Л Ь Н І .

Назавіце гэтыя кветкі.

Да стэнда, выробленага на аснове льнянога палатна, прымацаваны найбольш рэдкія садовыя і палявыя кветкі. Пераможцам у гэтай гульні стане той, хто першым назаве ўсе кветкі, прымацаваныя да палатна.

Кветкавы алфавіт.

На мяккім стэндзе ў алфавітным парадку прымацаваны літары. Пад стэндам на століку размешчаны выявы розных кветак. Сутнасць гульні ў тым, што гулец павінен пад кожнай літарай алфавіта прымацаваць кветку, назва якой пачынаецца з данай літары. Гэтую ж гульню можна правесці і шляхам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

запісу назваў кветак па алфавіту на звычайных школьных дошках. Выйграе той, хто хутчэй складзе кветкавы алфавіт.

Кветкавы алфавіт.

А. Архідэя Б. Бэз В. Вяргіня Г. Гіяцынт

Д. Дзьмухавец Ж. Жасмін З. Званочак К. Камелія

Л. Лілея М. Маргарыта Н. Нарцыс П. Прымула

Р. Ружа С. Сумнік Т. (няма назвы) У. Уюн

Ф. Фіялка Х. Хрызантэма Ц. Цюльпан Ч. Чаромха

Ш. Шыпшына Э. Эдэльвейс Ю. ( няма назвы ) Я. Язмін

" НАЗАВІ КВЕТКУ "

Удзельнікі двух каманд праз кветкавую гірлянду перакідваюць вянок, называючы пры гэтым пэўную кветку. Перамагае каманда, якая назаве больш кветак.

" КВЕТКА КАХАННЯ "
( трансфармаваная гульня " Падушачка " )

У карагодзе - юнакі і дзяўчаты, якія пад музыку ходзяць па кругу, У цэнтры круга - дзяўчына з кветкай. Калі музыка спыняецца, дзяўчына

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падыходзіць да хлопца, які стаіць насупраць яе, перадае яму кветку і запрашае ў круг. Хлопец і дзяўчына становяцца на калені і цалуюцца. Затым дзяўчына становіцца ў круг, а хлопец з кветкай - у цэнтры. Карагод працягвае свой рух і цяпер, па заканчэнні музыкі, хлопец перадае кветку дзяўчыне, якая апынецца насупраць яго, вынодзіць яе у цэнтр круга і яны цалуюцца. Гульня праводзіцца да тых пор, пакуль у цэнтры круга не перабываюць усе ўдзельнікі карагода.

" НАРАВІСТАЯ КВЕТКА "

Пад музыку ўдзельнікі, якія стаяць у крузе, перадаюць адзін аднаму кветку.

Калі музыка спыніцца, той у каго аказалася кветка, выбывае з гульні. Перамагае той удзельнік, які ў фінале застаецца без кветкі.

Гульнёва-пазнавальная праграма " РАМОНАК "

На гульнёвай пляцоўцы - канструкцыя рамонка, ў якой пялёсткі можна выцягнуць або адарваць ( канструкцыя зроблена з фанеры або з паперы ).

У праграме удзельнічаюць дзве каманды, удзельнікі якіх па чарзе бяруць адзін пялёстак і каманды выконваюць заданне, якое на ім напісана. Заданні могуць быць самыя рознастайныя. У нашым варыянце мы прапануем наступнае:

- На двух століках у агульным букеце стаяць лугавыя і лясныя кветкі беларускай зямлі ( штучныя кветкі ). Адна каманда выкладае кветкавую сцяжынку ў луг, а другая - ў лес. Хто хутчэй выкладзе сваю сцяжынку і па ёй дойдзе да фініша ?
- Якая каманда хутчэй спляце вянок з кветак ?
- Хто лепш намалюе рамонак з завязанымі вачыма ?
- Каманды павінны кветкамі ўпрыгожыць касцюм і даць яму назву.

У каго лепш атрымаецца ?
- Складзіце як мага больш слоў са слова " пальмаружа ".
- Скажыце, ў якой кветке Беларусі начуюць насякомыя ?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

( званочак )

- Адгадайце загадку :

Нікога не б"е, не калечыць,

Наадварот, толькі лечыць

З назвай цікавай такой

Кветачка..... ? ( зверабой )

- Уявіце сабе, што кветкі згубілі свае пялёсткі. Зараз вам будуць паказваць папяровыя пялёсткі, а вы адгадайце, якая кветка згубіла пялёстак ?

- Якую расліну называюць " сонечнай кветкай " ? ( сланечнік ).

- Праслухайце музычны фрагмент і назавіце твор і кампазітара ?

( гучыць вальс кветак з балета П.І.Чайкоўскага " Шчаўкунчык" ).

- Якая каманда збярэ на сваёй палове найбольшы хор і заспявае песню аб кветцы ?

" ТАНЦЫ З КВЕТКАМІ "

- Адной з дзяўчат культарганізатар дае кветку. Пачынаецца танец. Да дзяўчыны падыходзяць два хлопца. Аднаму яна аддае кветку, а з другім ідзе ў танок. Цяпер да хлопца з кветкай падыходзяць дзве дзяўчыны. Адной

ён аддае кветку, а другой пачынае танец. Да дзяўчыны з кветкай падыходзяць два хлопцы... Такім чынам ідзе запрашэнне ў танец усіх прысутных.

- У час танца адна з дзяўчын з кветкамі ў руках падыходзіць да абранай ім пары, ўручае кветкі дзяўчыне, а сама ідзе танцаваць з хлопцам. Дзяўчына, ў руках якой аказалася кветка, тое ж самае робіць з іншай абранай ёй парай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам букет кветак, як эстафета дзявочай або хлапецкай зацікаўленасці, праходзіць праз усіх танцуючых і застаецца напамяць дзяўчыне, ці хлопцу - каму не пашанцавала выбраць сабе абранніка. (Аналагічны танец - гульня можа адбывацца і пры дапамозе кветкавага вянка, які ўдзельнік ускладае на галаву дзяўчыны, ці хлопца, як бы пакідаючы іх у адзіноце ).

- Усім удзельнікам танца арганізатар раздае розныя кветкі. У час танца гучыць каманда удзельнікам сабрацца у букеты па пэўных кветках ( рамонкі - ў адзін круг, васількі - у другі, ружы - у трэці і да т.п.). У якім букеце будзе больш кветак - тая каманда атрымае прыз. Па гэтай аналогіі ў танцы можна "збіраць" букеты лясных, палявых, садовых, дэкаратыўных кветак.

- Культарганізатар кідае ўверх букет штучных кветак і ... танцпляцоўка ператвараецца ў кветкавы луг... ( Сцяблiны кветак зроблены на дротавай аснове з грузікам-вастрыём на канцы і, такім чынам, яны ўтыкаюцца ў драўляную падлогу танцпляцоўкі ). Пачынаецца вальс. Пара, якая ў час танца саб"е ці кране кветку - выбывае з танцавальнага конкурсу. Пары-пераможцы ўзнагароджваюцца прызамі.

" КВЕТКАВЫЯ ВАРОЖБЫ "

1. Дзяўчаты кідаюць вянкі на бярозу, загадваючы пры гэтым пэўнае жаданне. Калі вянок зачэпіцца за галінку дрэва - загаданае збудзецца.

2. Дзяўчаты варожаць на вянках на свой уласны лёс у гэтым годзе. Калі колькасць кветак у вянку цотная - быць у пары.

3. Дзяўчаты кідаюць вянкі ў касцёр. Чый вянок згарыць хутчэй - тая раней выйдзе замуж.

4. Дзяўчаты, адрываючы па аднаму пялёстку ад рамонка прыгаворваюць:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

" Любіць, не любіць, плюне, пацалуе, да сэрца прыцісне, да чорта пашле..." ( які прыгавор застанецца пры апоўняй сарванай кветцы - такі і вынік варожбы )

5. Дзяўчаты апускаюць вянкі ў ваду і сочаць: калі вянок паплыве далёка -

пойдзе замуж за межы роднай мясціны, калі прыстане да супрацілеглага берага - знойдзе сваё шчасце тут, на сваёй зямлі, калі яе вянок сутыкнуўся і паплыў з іншым вянком - у дзяўчыны будзе суперніца ў каханні, калі вянок кружыцца на месца - дзяўчыне трэба спыняць свае гулі і канчаткова абраць суджанага, калі вянок паплыў і прыстаў да берага пуска вянка - шчасце напаткае дзяўчыну ў будучым годзе.

6. Дзяўчына, пакрытая чубром, пад музыку раздае дзяўчатам вянкі: каму вянок дастаўся свежы - быць у пары, каму засохлы - не.

7. Хлопцы і дзяўчаты папарна кідаюць вянкі ў ваду: калі вянкі паплывуць і з"яднаюцца - быць у гэтым годзе вяселлю !

" АБ КВЕТКАХ, НАДЗЕЯХ, КАХАННІ "

( песні і вершы )

К А С Я

Словы Э. Пашкевіч ( Цёткі) муз. І. Лучанка

( з рэпетуару студыі " Сябры " )

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Як лілея на Дунаі,
Як пралеска ў белым гаі,
Цвіце Кася на ўсю вёску
Зоркай яснай, зоркай роснай

Прыпеў : Стан танюткі, як былінка,
Ну і Кася, ну , дзяўчынка !
Як царэўна, як багіня !
Як нарцыса, як вяргіня !

Вочы - неба, броў - чарненька,
А мая жа ты міленька !
Гараць шчочкі, з губ - маліны...
Не спаткаў такой дзяўчыны.

Прыпеў.

Як лілея на Дунаі,
Як пралеска ў белым гаі,
Цвіце Кася на ўсю вёску
Зоркай яснай, зоркай роснай.

Прыпеў: Стан танюткі, як былінка,
Ну і Кася, ну, дзяўчынка!
Як царэўна, як багіня!
Як нарцыса, як вяргіня!

АЛЕКСАНДРЫНА.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Словы П. Броўкі муз. У. Мулявіна

( з рэпертуару ансамбля " Песняры " )

Мне не забыцца песні той даўняе вясны :
На Мурамскай дарожцы стаялі тры сасны...
Цяпер магу прызнацца, тады пачаў кахаць,
Цябе з ніякай кветкай не мог я параўнаць.

Прыпеў: Александрына ! Цяпер прыйшла зіма...
Александрына ! Шукаю я - няма !
Александрына ! І з песняй ты цвіла...
Александрына ! Якою ты была !

Сказаць, што васілёчак, дык фарба ў ім адна,
Сказаць, што ты лілея, - сцюдзёная ж яна.
Сказаць, што ты званочак... Ды ўсіх жа мала іх !...
Такою ты здалася ў семнаццаць год маіх.

Прыпеў.

Д З І Я Н К А .

Словы А. Ставера Муз. І. Лучанка

За малым беларускім паўстанкам,
Дзе духмяна чаромха цвіла,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Шчабятуха-дзяўчынка Дзіянка,
Нібы ў радаснай казцы, расла.
Салаў'і калыханку ёй пелі,
Прабуджалі яе жаўрукі,
Ёй выводзілі лепшыя трэлі
Майскім днем маладыя шпакі.

Майскі ветрык лагодны, ласкавы,
Упрыгожыўшы беллю сады,
Надзяляў яе радасцю жвавай
І прывабнасцю легкай хады.
Прыбіраліся кветкамі сцежкі,
Дзе яна пажадала прайсці.
Падарыла ёй сонца усмешкі -
Залатыя прамені ў жыцці.

Залатыя палеткі - абшары
І начны зарапад залаты
Ёй далі незвычайныя чары,
Харaство і цяпло дабраты.
За малым беларускім паўстанкам,
Дзе духмяна чаромха цвіла,
Выйшла з дому аднойчы Дзіянка
І ў жыццё, нібы песня, пайшла.

Г Р О Н К А Б Э З У.

Словы Т. Ляшонка музыка М. Яцкова

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гронку бэзу колісь я табе прынёс ,

Ты ўзяла яе з глыбокім хваляваннем.

Гэты цуд з іскрыначкамі рос

Даў пачатак нашаму каханню.

Прыпеў: Гронка бэзу, гронка бэзу

Водар неба і жыцця

Гронка бэзу, гронка бэзу -

Нараджэнне пачуцця.

Кветкі тыя - водар светлае зары,

Яркі след хвалюючых спатканняў.

Гронка бэзу - памяць той пары

Нараджэння нашага кахання.

Прыпеў.

Вось і зараз, у завеі і мароз,

Пазнаю цябе - маю гарэзу -

Тыя ружы, што табе прынес,

Папрасіла памяняць на гронку бэзу.

Прыпеў.

НЕ ЗАБУДУЦЬ НЕЗАБУДКІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Словы Т. Трафімавай Музыка А. Атрашкевіча

Настрой цвіце нібы пад сонцам,
Як выпадзе спаткацца нам з табой,
Мы сустракаліся даволі рэдка,
Але ў думках ты заўсёды быў са мной.

Прыпеў: Не забудуць незабудкі
Той сустрэчы па вясне,
Не забудуць незабудкі -
Не забудзь і ты мяне.

Калі ж пяшчота ночы спавівае
І сэрцу ад самоты не да сну,
Я нумар тэлефона набіраю,
З далечыні твой голас успрымаю
Як светлую жаданую вясну.

Прыпеў.

Іскрыцца зноў вясёлкавае неба,
З душы струменіць радасці напеў...
Як мала часам закаханай трэба,
Каб любы цёплым словам абагрэў.

Прыпеў: Не забудуць незабудкі
Той сустрэчы па вясне,
Не забудуць незабудкі -
Не забудзь і ты мяне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ВАСІЛЬКІ

Музыка У. Гінько Словы І. Цітаўца

Хадзілі па арбіце летнія дзянькі,
Расквітнелі ў жыце кветкі васількі.
Вечар ярка зорыць мой радзімы кут,
Любы мне падорыць васільковы цуд.

Прыпеў: Вася, Вася, Васілёк, мой ласкавы галубок.
Незабудка я твая, без цябе сумую я.
Твае вочы, твае губы паланілі мяне, любы,
Я ўжо не я , я ўжо не я.

І два сэрцы млеюць ад гарачых слоў,
На душы квітнеюць горы васількоў,
Кветкі палявыя звяжуць у вянок,
Вёсны маладыя косіць Васілёк.

Прыпеў.

Ой ты, водар ночы, цеплыня рукі,
Васільковы вочы быццам васількі,
Сонна ночка тае аксамітам рос,
Два жыцці сплятае ў адзіны лёс.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прыпеў.

ПРАЛЕСКІ

Словы І. Цітаўца Музыка С. Панамарова

" Будзьце вочкі, як пралескі ", -
Маці родная казала,
" Вочкі, вочкі, наце кветкі ", -
Вочкі цалавала,
Калыхала маці мрою:
" Каб жылося добра дзеткам ".
І схіляла нада мною
Веснавыя кветкі.
Цяплыню яе пяшчоты
Атуляюць промні сонца,
Боль матулінай журботы
Мне баліць бясконца.
Не рабіць ні зла, ні шкоды,
Бачыць добрымі вачыма -
Гэтым звычкам назаўсёды
Маці навучыла.
У жыццёвым карагодзе
Пажадаю родным дзеткам:
" Між сабой жывіце ў згодзе,
Як пралескі - кветкі ! "
З дабрынёй у свет ідзіце,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Хай сумленне сведкам будзе,
І сваіх малых вучыце
Быць пралескай людзям.

НЕЗАБУДКІ

Словы І. Цітаўца Музыка А. Хадоскі

Ты аднойчы мне сказала -
Незабудкі любіш ты,
Палявыя, лугавыя,
Кветкі дзіўнай пекнаты.
Назбіраю незабудак
І ў вясновую пару
Я табе, мая гарэза,
Іх, як неба, падару.

Прыпеў: Незабудкі, незабудкі,
Аксамітам сініх рос
Спадабаліся вы любай,
Я душой да вас прырос.
Незабудкі, незабудкі,
Лета хутка прамільгне,
Падарыце радасць любай,
Прынясіце шчасце мне.

Зачаруюць яны вочы,
Іх краса цябе кране,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Светлым поглядам дзявочым
Ты аддзячыш шчыра мне.
У тваіх вачах ласкавых
Незабудак сінізна,
Дзе цябе вясной спаткаў я,
Толькі ведае вясна.

Прыпеў.

ЛІЛЕЯ

Словы І. Цітаўца Музыка Я. Навуменкі

За акном зімы завея
Думкі ў лета пазаве,
Там праз белыя лілеі
Лодка зыбкая плыве.
Ты ў лілеях - як нявеста,
І ў руцэ была рука...
На адным кружыла месцы
Лодку сіняя рака.

Прыпеў: Ах лілеі, ах лілеі
Над санліваю вадой !
Я не знаю дзён мілейшых,
Чым праведзеных з табой.
Тыя ласкі й чары

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Не забудуцца нідзе,
А мае ўсе думкі - мары
Зараз толькі пра цябе.

Зналі толькі зоры - павы
І лілеі ў ціхім сне,
Як глядзела ты ласкава,
Закахана на мяне.
Для мяне - як падарунак -
Голас чысты твой звініць.
Твой гарачы пацалунак
На губах маіх гарыць.

Прыпеў.

КВЕТКА

Словы І Цітаўца Музыка В. Кузняцова

Шчасцейка маё - дзеўку кахаю,
Дзяўчыну любую, радасць - красу.
Юлечка - Юля, сэрца атуліш,
Кветкі табе я нясу.

Прыпеў: Кветкі ў лузе, кветкі ў полі,
Кветкі ў душы расцвілі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ты - мая любая, ты - мая мілая,
Лепшая кветка зямлі.

Для маладосці - рай прыгажосці,
Кветкі аздобяць малінавы час,
А падарунак, як пацалунак,
Робіць бліжэйшымі нас.

Прыпеў.

Позірк яскравы, цёплы, ласкавы,
Стройная постаць твая.
Юлечка - Юля, мілая Юля -
Дзіўная кветка мая.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Черёмуха

Стихи М. Исаковского муз. М. Блантера

Что, друзья, случилося со мною, -
Обломал я всю черемуху весною,
Я носил, таскал ее возами,
А кому носил, вы знаете и сами.

Вечерком спешил я из-за речки,
Целый ворох оставлял я на крылечке,
Я бросал в окошко молчаливо
Белое, лесное, сказочное диво.

Я хотел, чтоб девушка вниманье
Обратила на мое существованье,
Чтоб она хоть раз, да услыхала,
Как душа моя в черемухе вздыхала.

А она, притворная, молчала,
Словно вовсе ничего не замечала,
Да к тому ж за все мои печали
На селе меня Чермухой прозвали.

Как иду я, шепчутся девчата:
Дескать, вон идет Черемуха куда-то,
И поют, конечно, не случайно:
Отчего, мол, ты, Черемуха, печальна ?

И хожу я со своею болью,
Со своею несказанною любовью,
Что мне делать, сам не понимаю,
Но сирень я тоже, видно, обломаю.

ЛУЧШЕ НЕТУ ТОГО ЦВЕТУ

Слова М. Исаковского Музыка М Блантера

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Лучше нету того цвету,
Когда яблоня цветет,
Лучше нету той минуты,
Когда милый мой придет.
Как увижу, как услышу -
Все во мне заговорит,
Вся душа моя пылает,
Вся душа моя горит.

